Ігар Пракаповіч

# Насельніцтва Пастаўскага краю

Паставы:
"Сумежжа"
2004.

**Насельніцтва Пастаўскага краю. – Паставы: ВІ “Сумежжа”, 2004. – 56 с.**

## КОЛЬКАСЦЬ ЖЫХАРСТВА І ЯЕ ЗМЕНЫ Ў ГІСТАРЫЧНЫМ ЧАСЕ

Тэрыторыя Пастаўскага края пачала засяляцца людзьмі вельмі даўно, з тых часоў, калі паўночную Беларусь пакінуў апошні ледавік і ўтварыліся спрыяльныя ўмовы для развіцця раслінасці і жывёльнага свету. Першыя жыхары – маленькія купкі паляўнічых, рыбаловаў, збіральнікаў – з'явіліся на нашай зямлі, верагодна, каля 8 – 9 тысячагоддзя да нашай эры. Магчыма, у даледавіковую эпоху і ў міжледавікоўі тэрыторыю края наведвалі групы палеаантрапаў, аднак сляды іх знаходжання тут былі знішчаны лёдам і ледавіковымі водамі.

Можна меркаваць, што да пачатку нашай эры колькасць насельніцтва паступова марудна павялічывалася, але дакладна прасачыць змены не магчыма з прычыны адсутнасці звестак.

Паспрабуем вызначыць прыблізную колькасць жыхароў на тэрыторыі раёна на пачатак нашай эры. Падлікі можна рабіць рознымі спосабамі, але, відавочна, яны павінны грунтавацца на вядомых гістарычных і археалагічных звестках аб умовах і асаблівасцях жыцця людзей у тую эпоху.

На мяжы эраў насельнікамі раёна былі прадстаўнікі банцараўскай археалагічнай культуры ранняга жалезнага веку, якія жылі радавымі сем'ямі, вялі аселы лад жыцця, займаліся пераважна паляваннем і рыбалоўствам, і таму ладзілі свае паселішчы каля рэк і азёр. Гісторыкі вызначылі, што колькасць жыхароў у паселішчах вагалася ў сярэднім ад 50 да 80 чалавек. Калі зрабіць дапушчэнне, што каля кожнага вадаёма месцілася па аднаму старажытнаму паселішчу, то можна падлічыць максімальна магчымую колькасць жыхароў. Улічваючы тое, што на тэрыторыі раёна знаходзіцца каля 200 вадаёмаў (каля 120 азёр і каля 80 рэк), то атрымаем лічбу 10 – 16 тысяч чалавек. Відавочна, што гэта задужа вялікія значэнні колькасці і, адпаведна, шчыльнасці насельніцтва на той далёкі час. Можна вызначыць і мінімальныя паказчыкі колькасці, калі ўзяць на ўвагу толькі вядомыя старажытныя паселішчы дaславянскай каланізацыі. А іх адкрыта зусім небагата: Задзеўе, Швакшты (Лысая гара), Данеўцы, Навадруцк, Саранчаны, Сарокі, Асінагарадок...Зыходзячы з гэтага, мінімальная колькасць насельніцтва раёна на пачатак нашай эры можа ацэньвацца ў 350 – 550 чалавек. Такім чынам, лік жыхароў Пастаўшчыны мог знаходзіцца ў вельмі вялікім дыяпазоне ад 10 000 да 350.

Паспрабуем вызначыць гэты паказчык іншым шляхам. Улічым тое, што для сталага пражывання патрыярхальнай сям'і на адным месцы неабходнай умовай з'яўляецца жыццёвая прастора –

тэрыторыя, рэсурсы якой у стане забяспечыць усю сям'ю патрэбным мінімумам харчавання. Паколькі асноўным заняткам старажытных людзей было паляванне і рыбалоўства, то можна меркаваць, што ўсе паселішчы "прывязваліся" да вадаёмаў, прычым гэтыя водныя аб'екты уключалі азёрныя групы або значныя адрэзкі рэк. Складана акрэсліць плошчу, якую кантралявала асобная патрыярхальная сям'я. Аднак, зазначым, што асноўныя паляўнічыя ўгоддзі знаходзіліся недалёка ад паселішча, і зробім дапушчэнне, што жыццёвая прастора складала каля 100 км$^2$ (10 х 10 км). Падзяліўшы плошчу раёна (2, 1 тыс. км$^2$ ) на 100 км$^2$ мы атрымаем 21 – колькасць старажытных паселішчаў у межах Пастаўскага раёна. Памножыўшы гэту лічбу на сярэднюю колькасць жыхароў у паселішчы, атрымаем прыблізную колькасць насельніцтва нашай мясцовасці – 1000 – 1500 чалавек.

Выкарыстаем яшчэ адзін метад падліку. Вызначым па тапаграфічнай карце найбольш спрыяльныя мясцовасці для ўтварэння старажытных паселішчаў. Гэта азёрныя групы: Швакшты, Сурвілішкі, Саранчаны, Камаі, Лодасі, Споры, Світа, Чэцверць, Азёркі, Бярозаўка, Чарты, Лучай, Свідна, Пліса, Варапаеўскія азёры, Белае, Ласіца, а таксама найбольшыя рэкі: Дзісна (3 паселішчы), Мядзелка (4 паселішчы), Лучайка (3 паселішчы), Камайка (1 паселішча), Лынтупка (2 паселішчы), Галбіца (3 паселішчы). Зрабіўшы разлікі, атрымаем лічбы 1500 – 2500 чалавек.

Такім чынам, можна лічыць, што напачатку нашай эры колькасць насельніцтва на тэрыторыі раёна складала 1–2 тысячы чалавек.

Можна меркаваць, што ў першых стагоддзях нашай эры колькасць жыхароў павольна павялічвалася, але ў IV – VI стагоддзях у дынаміцы адбыліся значныя змены. Гэта звязана з тым, што на нашу тэрыторыю пачалі распаўсюджвацца групы славянскіх плямёнаў, якія засялялі ў асноўным водападзелы – найбольш прыдатныя месцы для таго, каб займацца земляробствам і жывёлагадоўляй. Пры гэтым адбывалася сутыкненне з мясцовым балцка - угра-фінскім насельніцтвам, якое, напэўна, ў значнай ступені мела канфліктны характар. Археолагі сведчаць, што значная колькасць гарадзішчаў таго часу была спалена і закінута. Цяжка меркаваць, ці значна змянілася колькасць жыхароў у такіх суровых гістарычных варунках, бо невядома лічба ахвяр тых сутыкненняў і лічба мігрантаў-крывічоў, што прыйшлі ў нашу мясцовасць. Можна толькі сцвярджаць, што адбылася карэнная змена этнічнага складу насельніцтва.

Да X стагоддзя колькасць жыхароў на тэрыторыі раёна расла марудна. Пры высокай нараджальнасці была і высокая смяротнасць з прычыны кароткай працягласці жыцця і хваробаў. Паколькі лік

населеных пунктаў павялічыўся амаль удвая ў параўнанні з пачаткам нашай эры, то можна выказаць меркаванне, што і колькасць жыхароў узрасла да 3 – 3, 5 тысяч чалавек.

Да XIII стагоддзя паступова былі асвоены людзьмі не толькі рачныя даліны і ўзбярэжжы азёрных груп, але і прыдатныя месцы на выспах сярод балот Полацкай нізіны і на пагурках і ў лагчынах Свянцянскіх градаў. Так, напрыклад, толькі на Камайшчыне, на невялікай адлегласці знаходзяцца гарадзішчы ў Лапінцах, Камаях, Мумішках, Ёдаўцах, Каралінове.

Аднак размяшчэнне Пастаўшчыны на мяжы Полацкай і Нальшчанскай земляў, а пазней – на паўночным ускрайку Вялікага княства Літоўскага не спрыяла спакойнаму развіццю. Асабліва цярпела ліха мясцовае насельніцтва ў XIV – пачатку XV стагоддзяў, калі на край перыядычна накатваліся хвалі крыжацкіх набегаў. Князь Гедымін у сваім пасланні біскупу Дэрпскаму ў 1324 годзе, згадваючы аблогу Мядзела, скардзіцца:"...мноства людзей яны забілі і многіх павялі з сабой... Таксама роўна сорак дзён пасля яны зноў, як драпежныя ваўкі, люта спустошылі тую ж зямлю, бязлітасна забілі 80 чалавек..." Відавочна, што ў такой складанай палітычных варунках дынаміка колькасці насельніцтва была нестабільнай: павольнае павелічэнне жыхарства перарывалася імклівымі стратамі.

Пасля перамогі аб'яднаных войскаў ВКЛ і Кароны над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве (1410 год), на Пастаўшчыне ўсталявалася адноснае зацішша: амаль 200 гадоў ваенныя калясніца абміналі наш край. Спакойнае жыццё паўплывала на эканамічнае ажыўленне і аказала стабілізацыйнае ўздзеянне на дынаміку росту колькасці жыхароў. Праўда, у сярэднявеччы праз Еўропу пракаціліся хвалі спусташальных эпідэмій, якія забралі шмат жыццяў. Напэўна гэтыя пошасці не абмінулі і Пастаўшчыну, аднак звесткі пра іх ў крыніцах адсутнічаюць.

Першая магчымасць рэальнай ацэнкі ліку насельнікаў раёна з'яўляецца толькі ў матэрыялах інвентароў маёнткаў канца XIV – першай паловы XVII стагоддзя. Разлікі Г. М. Брэгера па маёнтку Паставы на 1555 год даюць лічбу ў 1800 жыхароў, на 1628 – 3060 (рост за 73 гады склаў 70%) [12, с. 56]. Калі выкарыстаць методыку згаданага аўтара, то можна разлічыць прыблізную колькасць насельнікаў у маёнтку Дунілавічы (інвентар 1640 года) і Задзева (суч. Задзеўе) (інвентар 1649 года). У першым з іх пражывала каля 160 гаспадароў, што адпавядае колькасці 1720 чалавек, у другім – 331 гаспадар і 2979 чалавек. Склаўшы разам паказчыкі ліку жыхарства ў маёнтках Паставы, Задзеў, Дунілавічы і, улічыўшы, што яны разам

займалі каля трацiны тэрыторыі сучаснага Пастаўскага раёна, можна вылічыць колькасць насельніцтва нашага краю ў першай палове XVII стагоддзя. Яно складала 23277 чалавек.

Гэту лічбу можна праверыць. Як вядома, на той час Пастаўшчына ўваходзіла ў склад Ашмянскага павета, у якім пражывала 213794 чалавекі (паведле дадзеных В. Мялешкі). Беручы на ўвагу тое, што наш раён займаў прыблізна 9 частку павета, у выніку разлікаў атрымаем лічбу 23754. Як бачым, яна амаль такая ж, як і папярэдняя.

Калі ўлічыць, што з 1555 па 1628 жыхарства павялічылася на 70 %, то можна лічыць, што ў сярэдзіне XVI стагоддзя колькасць насельніцтва была 13700 чалавек.

Калі б на працягу ўсяго XVII стагоддзя тэмпы росту колькасці насельніцтва захаваліся такімі ж высокімі, то на 1800 год на нашай зямлі ўжо пражывала б каля 40 тысяч, а ў першай палове XIX стагоддзя людзй тут налічвалася больш, чым сёння. Аднак, у сярэдзіне XVII стагоддзя на тэрыторыю раёна прыйшла самая жорсткая і бязлітасная вайна ў гісторыі Беларусі. Прынесена яна была маскоўскімі акупацыйнымі войскамі, якія пакідалі за сабой у літаральным сэнсе выпаленую зямлю. Гэта сёмая вайна паміж Расіяй і ВКЛ (Рэччу Паспалітай) 1654 – 1667 гадоў, якая ў беларускай гісторыяграфіі больш вядома пад назвай “невядомая вайна” з прычыны замоўчвання асноўных падзей, фактаў і вынікаў баявых дзеянняў.

У Ашмянскім павеце, у якім тады знаходзіліся Паставы, страты насельніцтва склалі 114760 чалавек, што адпавядае 53, 7% даваеннага насельніцтва, гэта значыць, што загінуў або быў пагнаны ў расійскі палон кожны другі жыхар. У Паставах і трох бліжэйшых вёсках пасля вайны (у 1672 годзе) пражывала ўсяго толькі 5 сем’яў, хоць перад расійскім нашэсцем ў мястэчку іх налічвалася больш за 160. Паселішча практычна было знішчана. Людскія страты ў межах раёна склалі не меней 12 тысяч чалавек. З гэтай прычыны ў 70-я гады XVII стагоддзя на Пастаўшчыне пражывала не болей 10000 жахароў.

Канец стагоддзя быў адносна спакойны, што паспрыяла эканамічнаму аднаўленню гаспадаркі і паступоваму росту насельніцтва. Аднак пачатак новага, XVIII стагоддзя, супаў з перыядам чарговага зацяжнога ліхалецця. Распачаліся вайна паміж рускімі войскамі Пятра I і шведскай арміяй Карла XII. Паставы апынуліся троху ў баку ад асноўнага тэатра баявых дзеянняў, якія амаль спляжылі Гарадзенскую губернію, але поўнасцю пазбегнуць навалы мясцоваму люду не ўдалося. Рабаўніцтвам займаліся

размешчаныя тут вайсковыя аддзелы, а ў 1709 годзе праз Пастаўшчыну прайшоў 16-тысячны корпус шведскага войска над камандаваннем Левенгаўпта, які імкнуўся на дапамогу арміі свайго караля Карла XII. Маюцца звесткі, што ягоныя атрады праходзілі праз Паставы, Споры, Камаі. Камайскі абарончы касцёл знаходзіўся ў аблозе – пра гэта сведчаць каменныя ядры шведскіх гармат, што ўмураваныя ў сцены. А ў Яцэвічах распавядаюць легенду пра тое, як касцёл, што стаяў тады на мясцовым гарадзішчы, праваліўся скрозь зямлю разам са шведамі, якія ўварваліся ў яго і пасеклі мячамі святыя абразы. Хутчэй за ўсё касцёл быў спалены, што сведчыць пра гвалт, які чыніўся захопнікамі ў дачыненні да мясцовых святыняў і мясцовага насельніцтва. Разам з вайной на жыхароў абрынулася і іншая пошасць: у пачатку XVIII стагоддзя край спасцігла вялікая засуха, а з 1708 па 1711 – эпідэміі розных хваробаў. Як адзначалася ва універсале 1711 года, у выніку эпідэмій некаторыя гарады і мястэчкі "сталі амаль пустымі", колькасць жыхароў у населеных пунктах зменшылася на 30 – 35 % . Такія складаныя варункі жыцця прывялі да таго, што на Пастаўшчыне засталося ўсяго каля 9300 жыхароў.

Другая палова стагоддзя прайшла адносна спакойна, што паспрыяла даволі хуткаму аднаўленню насельніцтва. Паводле разлікаў гісторыкаў, колькасць люду ў беларускіх ваяводствах і паветах з 1717 па 1791 гада павялічылася з 1, 5 млн да 3, 6 млн, гэта значыць вырасла амаль у два з паловай разы. Калі спраецыраваць гэту тэндэнцыю на Пастаўшчыну, то атрымаецца, што ў канцы XVIII стагоддзя на нашай зямлі пражывала ўжо 22320 жыхароў.

Наогул, канец гэтага стагоддзя – пара росквіту Паставаў. Менавіта на гэты час прыпадае актыўная дзейнасць у ім Антонія і Канстанціна Тызенгаўзаў, якая прывяла да развіцця мануфактур, рамёстваў, культуры. Гэтыя працэсы ў пэўнай ступені актывізавалі міграцыю, стымулявалі рост насельніцтва ў мястэчку. У 1783 годзе у Паставах было 198 двароў, 1386 жыхароў.

Разгледжаныя асаблівасці дынамікі насельніцтва дазваляюць вызначыць пэўную тэндэнцыю: пачатак кожнага новага стагоддзя прыносіць насельніцтву пакуты і выпрабаванні. Так здарылася і на золаку XIX : падзелы Рэчы Паспалітай, акупацыя края расійскімі войскамі, паўстанне Т. Касцюшкі, нашэсце армій Напалеона. Найбольшыя страты мясцовае насельніцтва панесла ў час вайны 1812 года, якая для беларусаў стала чарговай грамадзянскай. Праз Паставы праходзілі войскі Жэрома, а сам Напалеон праехаў праз наш край 17–18 ліпеня, калі накіроўваўся з Гадуцішак у Глыбокае.

Паводле звестак І. Быхаўца, многіх жыхароў Пастаўшчыны, асабліва мужчын (толькі з Лынтупшчыны каля 10 тысяч), французы пагналі з сабой. У лісце павятовай шляхты паведамлялася: “Пастаянныя пераходы мнагалікіх войскаў адвялі ў нас усё: коней, жывёлу, адабралі ў нас падначаленых, неараная зямля стала пустыром”[3, с. 34].

На наш погляд, лічба ў 10 тыс толькі для Лынтупшчыны з'яўляецца завышанай, хаця велічыня людскіх страт сапраўды вялікая. Калі прыняць яе за 20 – 30 %, то абсалютнае змяншэнне складзе каля 5 – 7 тысяч чалавек. З гэтага вынікае, што пасля напалеонаўскага нашэсця колькасць насельнікаў края паменшылася да 15624 жыхароў.

Хаця ў XIX стагоддзі рэгулярна праводзіліся рэвізіі з мэтай уліку насельніцтва, вызначыцца дакладна з колькасцю жыхарства на Пастаўшчыне даволі складана. Прычына таму – змены ў адміністрацыйным падзеле, якія прывялі да таго, што наш край апынуўся ў розных паветах: Лынтупшчына – у Свянцянскім, Пастаўшчына – у Дзісненскім, Варапаеўшчына – у Вілейскім.

Для прыблізных разлікаў возмем на ўвагу дадзеныя М. В. Доўнара-Запольскага з кнігі “Гісторыя Беларусі”, у якой ён, спасылаючыся на працы тагачасных расійскіх эканамістаў прыводзіць паказальнікі шчыльнасці насельніцтва для беларускіх губерній. Скарыстаўшыся дадзенымі па Віленскай губерніі і правёўшы разлікі, атрымаем для тэрыторыі раёна наступныя лічбы: 1830 год – 23940 чалавек, 1846 і 1851 – 39060, 1858 – 43680. Як бачым, амаль 20 гадоў спатрэбілася для таго, каб дасягнуць паказчыкаў канца XVII стагоддзя.

Калі да 40-х гадоў прырост насельніцтва быў яшчэ адчувальны, то ў наступным дваццацігоддзі ён стаў зусім нязначны, а ў асобныя гады адсутнічаў. На факт замаруджвання прыросту насельніцтва на беларускіх землях, які адбываўся ва ўмовах мірнага часу, звярнулі ўвагу не толькі расійскія эканамісты, але і царскі ўрад. Такая з'ява стала вынікам дзвюх прычын. Па-першае, пасля паўстання 1830 – 1831 гадоў, у якім актыўна ўдзельнічала і частка жыхароў Пастаўшчыны, памешчыцкі прыгнёт узмацніўся да такой ступені, што з сялян літаральна выціскалі сокі. Афіцыйная справаздача пра становішча ў Віцебскай губерні сведчыць, што “сяляне амаль не ведаюць хлеба, харчуюцца грыбамі і рознымі сырымі рэчывамі, якія нараджаюць хваробы; галеча страшная, а побач раскоша памешчыкаў; жыццёвыя сілы краю зусім вычарпаліся ў маральных і фізічных адносінах; расслабленне дасягнула апошняй мяжы”.

Па-другое, неўраджайныя гады ішлі адзін за другім. На працягу 30 гадоў неўраджаі былі 10 разоў. Асабліва цяжкае становішча склалася ў 1844 – 1845 гадах. Сацыяльныя, эканамічныя і прыродныя няўрадзіцы перапляліся ў небяспечны, блізкі да выбуху, клубок, што і выявілася ў 60-я гады ў аграрнай рэформе і паўстанні К. Каліноўскага.

Хоць Пастаўшчына і знаходзілася ў зоне дзеяння паўстанцкіх атрадаў і тут адбываліся ўзброеныя сутычкі з урадавымі войскамі, гэта не аказала вялікага ўплыву на паказчыкі колькасці насельніцтва. А вось рэформа паспрыяла паскарэнню эканамічных працэсаў, дала штуршок для развіцця гаспадаркі, што асбліва стала заўважна ў канцы стагоддзя. Эканамічны ўздым і частковае разняволенне сялян праявілася і ў дынаміцы насельніцтва. Так, колькасць жыхароў 6 беларускіх губерняў павялічылася з 5, 6 млн душ у 1863 годзе да 14 млн у 1914, гэта значыць, у 2, 5 разы. Назіраўся ўзмоцнены натуральны прырост блізкі да 2 % за год. Павелічэнне сярэдняй шчыльнасці насельніцтва да 49 чалавек на квадратную вярсту ў 1914 годзе прывяло да аграрнай перанаселенасці асобных рэгіёнаў.

Разлікі паказваюць, што перад першай сусветнай вайной колькасць жыхароў нашага краю дасягнула самага высокага паказчыка за ўсю папярэднюю гісторыю. Розныя методыкі падліку даюць лічбы ад 110 да 130 тысяч жыхароў. Возьмем за аснову сярэдні з атрыманых паказчыкаў – 112 тысяч. Пры такой колькасці шчыльнасць складала 53, 3 чал/км$^2$, што больш за сучасную сярэднебеларускую.

Як ужо было заўважана, напачатку кожнага новага стагоддзя насельніцтва сутыкаецца з вялікімі праблемамі для свайго развіцця. У пачатку XX –га жыхарам Беларусі і, асабліва, Пастаўшчыны давялося прайсці праз пекла першай сусветнай вайны. Наш край апынуўся паміж молатам і кавадлам. У адрозненні ад папярэдніх нашэсцяў чужынцаў, якія рухаліся, так бы мовіць, транзітам, першая імперыялістычная расцяла калючы дрот лініі фронту як раз пасярэдзіне раёна і трымала яго з 1915 па 1918 гады. Страты насельніцтва былі значныя: вялікая колькасць рушыла ў эвакуацыю, частка загінула пад час баявых дзеянняў, частка не вытрымала марадзёрства, рабаўніцтва, галечы і голаду. Няма дакладных звестак аб зменах у складзе мясцовага насельніцтва, але ўражваюць падлічаныя страты вайскоўцаў на ўчастку Нарачанскай аперацыі (Мядзельскі і Пастаўскі раён): у 2-ой расійскай арміі было забіта і паранена 1018 афіцэраў і 77427 салдат, нямецкія страты ацэньваюцца ў 30 – 40 тысяч вайскоўцаў.

Вайна выклікала інтэнсіўныя міграцыйныя патокі: баявыя дзеянні прымушалі жыхароў пакідаць свае вёскі і, асабліва, горад Паставы, які амаль на тры гады апынуўся на лініі фронту паміж дзвюма арміямі. Заканчэнне вайны паспрыяла вяртанню жыхароў да родных мясцін. Верагодна страты цывільнага насельніцтва былі не такія вялікія, як пад час войнаў папярэдніх стагоддзяў, бо паводле звестак (кн. "Памяць"), у 1925 годзе, калі наш край ужо ўваходзіў у склад другой Рэчы Паспалітай, ва ўтвораным Пастаўскім павеце пражывала каля 110 тысяч жыхароў, а ў Паставах – каля 5000. Лічба колькасці жыхароў у райцэнтры падаецца малаверагоднай, бо ў пачатку XX стагоддзя тут пражывала ўсяго 2113 чалавек, а Паставы ж былі моцна разбураныя вайной. Да таго ж, у 1939 годзе ў мястэчку пражывала усяго 3400 чалавек. Магчыма, разам з мясцовымі жыхарамі ў 1925 годзе ўлічваліся і вайскоўцы, якія тут размяшчаліся, але гэта пытанне патрабуе высвятлення.

Эканамічнае развіццё "крэсаў усходніх" у складзе Польскай дзяржавы ішло марудна, але ўстойліва. З прычыны няпэўнага палітычнага статусу прамысловасць тут амаль не развівалася, існавала выражаная аграрная спецыялізацыя края. Адносная стабільнасць спрыяла росту колькасці насельніцтва раёна. Захоўвалася высокая нараджальнасць, некалькі зменшылася смяротнасць, павялічылася працягласць жыцця. Склад сем'яў быў традыцыйна вялікі – 6 – 10 чалавек. У выніку гэтых працэсаў перад пачаткам другой сусветнай вайны колькасць насельніцтва на Пастаўшчыне дасягнула свайго другога максімума: 1939 год – 92 218 чалавек, 1941 – 101 116 чалавек.

Набліжэнне вайны стымулявала міграцыю. Пакідалі раён і з'язджалі ў Польшчу асаднікі, землеўладальнікі, больш заможныя сяляне-католікі. Пасля ўсталявання савецкай улады ў 1939 годзе частка насельніцтва была рэпрэсавана і выслана ў Сібір або знішчана.

Баявыя дзеянні пад час другой сусветнай вайны прынеслі вялікія людскія страты. У Беларусі яны склалі 25 %, на Віцебшчыне – 30 %. За час вайны на Пастаўшчыне толькі фашыстамі знішчана 4062 мірныя жыхары, пераважна яўрэі; 1800 чалавек вывезена ў Германію; значная колькасць пакінула родныя мясціны; частка мужчын была мабілізавана ў войска. З 1941 па 1945 год насельніцтва раёна зменшылася на 22 тысячы і склала на канец вайны каля 79 тысяч чалавек.

У пасляваенны час дынаміка колькасці насельніцтва фармавалася пад уплывам пастаяннага памяншэння натуральнага прыросту і зменай хваляў міграцый за межы раёна. Пачынаючы з 60-

х гадоў назіралася ўстойлівае зніжэнне нараджальнасці з адначасовым павелічэннем смяротнасці. У пачатку 70-х адбылася катастрафічная з'ява ў паказчыках натуральнага прыросту сельскага насельніцтва: смяротнасць зраўнялася з нараджальнасцю і ў наступныя гады пачала ўстойліва перавышаць яе, прычым розніца паміж гэтымі паказчыкамі пастаянна павялічваецца. Калі ў 1990 годзе каэфіцыент натуральнага прыросту па раёну складаў -3, 2 чалавекі на 1000 жыхароў, то ў 2001 ён апусціўся да –12, 1.

Вялікі ўплыў на дынаміку насельніцтва ў пасляваенныя гады аказала адмоўнае сальда міграцый. Значна больш людзей раён пакідала, чым прыязджала. Асноўныя міграцыйныя патокі складаліся з перасялення часткі палякаў (беларусаў – католікаў) пасля вайны ў Польшчу, пасляваеннай партызанкі і рэпрэсій, масавага выезду моладзі па камсамольскіх пуцёўках на цэліну і ў Карэлію ў 50-я гады, пераезду жыхароў з сельскай мясцовасці ў гарады ў 60 – 80 гады.

У 1970 годзе ў раёне налічвалася 62243 жыхары, у 1989 – 49911. Тэндэнцыя змяншэння колькасці насельніцтва захоўваецца і зараз. На пачатак 2002 года ў раёне пражывала 46372 жыхары. Галоўная прычына такой дэмаграфічнай сітуацыі – адмоўны натуральны прырост, што звязана з парушэннем полаўзроставай структуры, высокай доляй старых (больш 20 %), сацыяльна-эканамічнымі і экалагічнымі праблемамі, што ў сваю чаргу выяўляецца ў нізкай нараджальнасці і вялікай смяротнасці.

## НАРАДЖАЛЬНАСЦЬ І СМЯРОТНАСЦЬ. НАТУРАЛЬНЫ ПРЫРОСТ

Да сярэдзіны XX стагоддзя для Пастаўшчыны быў характэрны высокі натуральны прырост, які адпавядаў другому тыпу ўзнаўлення насельніцтва. Яго адметнасць заключалася ў высокай нараджальнасці, і хоць смяротнасць таксама была досыць высокая, усё ж розніца – прырост – выглядала значнай. Так у XIX стагоддзі з 1814 па 1846 гады насельніцтва павялічылася з 15624 да 39060 чалавек, гэта значыць, што прырост за 32 гады склаў 23436 чалавек. На рост колькасці, вядома, паўплывала пасляваенная кампенсацыйная міграцыя, аднак, можна сцвярджаць, што натуральны прырост у тыя часы быў большы, чым 20 чалавек на 1000 жыхароў.

У 30 – 40 гадах XX стагоддзя лічбы натуральнага прыросту ваганіся ад 13 да 15 чалавек на тысячу жыхароў пры нараджальнасці 26 – 28 чал / тыс., а смяротнасці 13 – 15 чал / тыс.

Пасля другой сусветнай вайны паказчыкі натуральнага прыросту пачалі павялічвацца, дасягнуўшы ў 1960 годзе адзнакі 17, 2 чал /тыс. Развіццё медыцыны, паляпшэнне ўмоў пражывання, павелічэнне працягласці жыцця людзей паўплывалі на рэзкае зніжэнне паказчыка смяротнасці: на той час ён складаў каля 6 чалавек на тысячу жыхароў. Бадай, гэта самыя нізкія лічбы смяротнасці за ўсю гісторыю нашага края. Нараджальнасць троху знізілася, але працягвала заставацца на высокім узроўні – 23 – 25 чалавек на тысячу.

Пачынаючы з 60-х гадоў у дэмаграфічнай сітуацыі раёна пачалі назірацца небяспечныя тэндэнцыі. З аднаго боку, адбывалася імклівае падзенне нараджальнасці, з другога – паступовае павелічэнне смяротнасці. У сярэдзіне сямідзесятых гадоў абодва паказчыкі зраўняліся.Так, у сельскіх паселішчах Віцебскай вобласці нараджальнасць стала роўнай смяротнасці ў 1973 годзе (па 12 чал / тыс), а на Беларусі – у 1978. З гэтых часоў смяротнасць пастаянна перавышае нараджальнасць, прычым, розніца з кожным годам павялічваецца і набывае пагражальныя памеры. Агульныя паказчыкі натуральнага прыросту ў раёне і ў вобласці былі крыху большыя за кошт больш спрыяльнай дэмаграфічнай сітуацыі ў асяроддзі гарадскога насельніцтва.

Апошняе дзесяцігоддзе XX стагоддзя і пачатак XXI стагоддзя захоўваюць небяспечную тэндэнцыю. Калі ў 1990 годзе нараджальнасць складала 12, 4 чал / тыс, а смяротнасць – 15, 6 чал / тыс, то ў 2001 годзе лічбы сталі адпаведна 7, 3 і 19, 4. Такім чынам, каафіцыент натуральнага прыросту ўпаў з –3, 2 (1990 г.) да –12, 1 (2001 г.).Лічбы сведчаць пра яўна выражаны дэмаграфічны крызіс. Адбываецца фізічнае выміранне карэннага насельніцтва края. У абсалютных лічбах колькасць жыхароў Пастаўшчыны з 1990 па 2002 год зменшылася з 52, 1 да 46, 4 тысяч.

У апошні час колькасць насельніцтва раёна штогод скрачаецца на 700 – 800 чалавек, прычым, гэты працэс ахапіў і сельскія, і гарадскія населеныя пункты. На Пастаўшчыне паказчыкі натуральнага прыросту у сельскіх паселішчах на 2001 год характарызуюцца лічбай –19, 7 чал /тыс, у гарадскіх - -6, 0 чал / тыс.

Такая драматычная сітуацыя з натуральным прыростам назіраецца па ўсёй Віцебскай вобласці і па Беларусі, прычым у

вобласці Пастаўшчына не лідэр: яе апярэджваюць Полацкі ( -16, 1), Талачынскі і Сенненскі ( па –14, 7) раёны. Найбольш спрыяльная (калі так можна сказаць) сітуацыя ў Чашніцкім раёне, дзе натуральны прырост мае паказчык –7, 8 чал / тыс.

Як паазваюць лічбы, мы маем вельмі небяспечную сітуацыю ў працэсе ўзнаўлення насельніцтва. Захаванне вызначанай тэндэнцыі пагражае беларускай нацыі дэградацыяй і выміраннем.

На з'яўленне такой сітуацыі аказалі ўплыў многія фактары: сацыяльна-эканамічныя, эмацыянальна-псіхалагічныя, культуралагічныя і шэраг іншых. Эканамічны крызіс апошняга дзесяцігоддзя, няўпэўненасць у заўтрашнім дні, зніжэнне сацыяльнай і медыцынскай абароненасці людзей, занятасць на вытворчасці (асабліва жанчын), фобія наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, праблемы экалогіі і СНІДу, імідж сямейных адносін у высокаразвітых краінах, хваробы, парушаны лад жыцця, п'янства – вось далёка няпоўны спіс прычын, якія ў цесным перапляценні сфармавалі сучасную дэмаграфічную сітуацыю. Але адна з галоўных прычын, на думку аўтара, заключаецца ў разбурэнні традыцыйнай беларускай вёскі і, як следства, ліквідацыі спрадвечнай народнай культуры і побыту, што разам з вынішчэннем мовы карэннага насельніцтва ставіць пад пагрозу выжыванне ўсёй нацыі.

Дэпапуляцыя насельніцтва Беларусі назіраецца з 1993 года. За перыяд з 1990 па 2002 год каафіцыент нараджальнасці знізіўся на 34, 5 % і склаў 9, 1 чалавека на 1000 (што ніжэй, чым у гады другой сусветнай вайны), а смяротнасць узрасла за гэты ж перыяд на 26 %. Паводле разлікаў дэмографаў, калі ў бліжэйшыя гады не ўдасца прыпыніць працэс вымірання беларускай вёскі, то на працягу наступных 40 гадоў у сельскай мясцовасці ўжо практычна не застанецца працаздольнага насельніцтва.

А па ўсёй Беларусі толькі ў 51 горадзе нараджальнасць перавышае смяротнасць, прычым у Віцебскай вобласці такіх гарадоў няма.

## СЯМЕЙНЫ СТАН. ШЛЮБЫ І РАЗВОДЫ

На дэмаграфічную сітуацыю значны ўплыў аказвае сямейны стан насельніцтва. Для Пастаўшчыны ў мінулым былі характэрныя вялікія (6 – 10 дзяцей) трывалыя сем'і. Аднак, як і ў большасці еўрапейскіх краін, зараз назіраецца зніжэнне ролі і каштоўнасці сямейных адносін у грамадстве, падае колькасць зарэгістраваных шлюбаў і адначасова павялічваецца колькасць разводаў.

Так, паводле перапісаў, у Пастаўскім раёне з 1979 па 1989 гады колькасць сем'яў зменшылася на 2285, што склала 13, 5 % ад агульнага паказчыка. На 1999 год сярод насельніцтва старэй за 16 гадоў у шлюбе знаходзілася 71, 8 % мужчын (зніжэнне за апошняе дзесяцігоддзе на 3, 3 %) і 58, 7 % жанчын (зніжэнне за такі ж перыяд на 3, 1 %). Меншая доля замужніх жанчын звязана са значным перавышэннем колькасці жанчын над мужчынамі ў пажылым узросце.

З прычыны большай працягласці жыцця ў жанчын, вельмі розняцца паказчыкі колькасці ўдоў і ўдаўцоў. Калі сярод мужчын такіх толькі 4 %, то сярод жанчын – аж 23, 9 %.

Павялічваецца доля людзей, якія скасавалі шлюб. З 1989 па 1999 гады разведзеных мужчын паболела на 2, 8 % ( з 3, 0 % да 5, 8 %), жанчын – на 3 % (з 3, 8 % да 6, 8 %). Наогул, з 1990 года выяўна прасочваецца тэндэнцыя на памяншэнне каафіцыента шлюбнасці (колькасці шлюбаў на 1000 чалавек насельніцтва) і павелічэнне каафіцыента разводзімасці. Так, калі каафіцыент шлюбнасці ў 1990 годзе складаў 7, 8 , то ў 2000 – усяго 4, 6, дасягнуўшы свайго найменшага значэння за ўсю гісторыю. Каафіцыент разводзімасці за гэты ж перыяд павялічыўся з 2, 1 да 3, 3, прычым у 1997 і1999 ён дасягаў велічыні 4, 3.

У бліжэйшыя гады ў Беларусі вельмі верагодны рост паказчыкаў шлюбнасці з прычыны павелічэння ва ўзроставай структуры насельніцтва долі моладзі – гэта хваля так званага “бэбі-буму” канца 70-х – пачатку 80-х гадоў. Аднак, на Пастаўшчыне гэты працэс, напэўна, будзе не вельмі заўважны з прычыны неспрыяльнай полаўзроставай структуры, хаця ў 2001 годзе ў параўнанні з папярэднім каафіцыент шлюбнасці павялічыўся на 0, 4.

## ДЗЕЦІ – ДАРОСЛЫЯ - СТАРЫЯ

Па ўзросту насельніцтва падзяляецца на тры групы: маладзей за працаздольны ўзрост (да 16 гадоў), працаздольнае насельніцтва (мужчыны – 16 – 59 гадоў, жанчыны – 16 – 54 гады) і старэй за працаздольны ўзрост. Прасачыць суадносіны паміж гэтымі групамі з часоў далёкай даўніны немагчыма з прычыны адсутнасці звестак, аднак можна выказаць некалькі меркаванняў. Вядома, што на Беларусі да пачатку XX стагоддзя сярэдняя працягласць жыцця была меншая, чым зараз, сем'і мнагадзетныя, а паказчыкі нараджальнасці і смяротнасці вялікія. З гэтых прычын доля старых людзей у

грамадстве была нязначнай (верагодна менш 10 %), а дзяцей дасягала 30 % і больш.

У другой палове XX стагоддзя у сувязі з развіццём медыцыны, скарачэннем дзіцячай смяротнасці і смяротнасці ад хваробаў, падзеннем нараджальнасці, павелічэннем працягласці жыцця, паляпшэння сацыяльна-эканамічных умоў жыцця адбыліся вельмі значныя змяненні ва ўзроставай структуры. Па-першае, значна вырасла доля жыхароў пасляпрацаздольнага ўзросту. Так у 1979 годзе яна складала 24, 5 % насельніцтва раёна, у 1989 – 29, 5 %, у 1999 – 29, 0 %. У абсалютных лічбах назіраецца памяншэнне колькасці пажылых людзей з 14744 чалавек у 1989 годзе да 12116 – у 2001, што звязана са зніжэннем агульнай колькасці жыхароў у раёне.

Паводле класіфікацыі ААН, насельніцтва лічыцца старым, калі доля асоб ва ўзросце больш 65 гадоў перавышае 7 %. На Пастаўшчыне па дадзеных перапісу 1999 года доля гэтай групы насельніцтва складала 20 %, прычым, гарадскога – 13,2 %, сельскага – 28 %. На пачатак 2001 года доля асоб ва ўзросце больш 65 гадоў складала 20, 4 %. Прыведзеныя паказчыкі сведчаць, што працэс старэння насельніцтва раёна працягваецца.

Вельмі трывожная тэндэнцыя назіраецца ва ўзроставай групе да 15 гадоў. Калі ў нашым краі ў 1979 годзе пражывала 12368 дзяцей, то праз 10 гадоў іх колькасць зменшылася на 2 тысячы, а яшчэ праз дзесяцігоддзе – на тысячу і ў 1999 годзе склала 9203 чалавекі, што адпавядае 19 % усяго насельніцтва.

Скарацілася і агульная колькасць працаздольнага насельніцтва з 31030 чалавек ў 1979 годзе да 24297 у 1999, хаця доля гэтай групы ў агульнай колькасці засталася прыблізна пастаянная – каля 50 %.

Напачатку 2002 года суадносіны паміж узроставымі групамі выглядалі наступным чынам: дзеці да 15 гадоў – 7992 асобы (17, 2 %), дарослыя (15 – 60 гадоў) – 26264 асобы (56, 6 %), старыя (звыш 60 гадоў) – 12116 асоб (26, 1 %). Вельмі трывожным з’яўляецца той факт, што найменшую групу насельніцтва складаюць дзеці ва ўзросце ад 0 да 4 гадоў – усяго 1890 чалавек. Заўважым, што менш 2 тысяч налічвае толькі група людзей узросту больш 80 гадоў. Самымі шматлікімі з’яўляюцца групы 40 – 44 гадоў (3793 чалавекі), 35 – 39 гадоў (3423 чалавекі), 10 – 14 гадоў (3606 чалавек).

У размеркаванні насельніцтва па ўзростах выяўна прасочваецца хвалістая заканамернасць: узроставыя групы павышанай колькасці чаргуюцца з групамі паніжанай колькасці. Да першай групы можна аднесці ўзросты 10 – 20, 30 – 50, 60 – 75 гадоў, да другой – 0 – 10, 20 – 30, 50 – 60.

Падводзячы вынікі, можна зрабіць выснову, што Пастаўшчына мае вельмі неспрыяльную ўзроставую структуру насельніцтва, якая характарызуецца нізкай доляй дзяцей (асабліва ва ўзросце 0 –4 гадоў) і высокай доляй людзей пасляпрацаздольнага ўзросту. Такая структура ўскладняе сацыяльна-эканамічнае развіццё, бо на аднаго працаздольнага прыходзіцца адзін непрацаздольны.

## МУЖЧЫНЫ І ЖАНЧЫНЫ

На Пастаўшчыне, як і па ўсёй Беларусі, жанчын пражывала больш, чым мужчын. Напачатку XX стагоддзя розніца паміж колькасцю асоб рознага полу была нязначная, і перавага жанчын стала вынікам большай працягласці жыцця. Сур'ёзна змяніліся суадносіны пасля першай і, асабліва, другой сусветнай вайны. Мужчынская частка насельніцтва панесла страты, што выклікала дыспрапорцыю ў палавой структуры. Пасля вайны доля жанчын складала каля 55 % . З цягам часу розніца паміж колькасцю мужчын і жанчын паступова памяншалася.

Па перапісу 1989 года ў раёне пражывала 23076 мужчын (46, 2 %) і 26835 жанчын (53, 8 %), прычым, калі ў 1979 годзе на тысячу жанчын прыпадала 854 мужчыны, то ў 1989 – 860.

За 10 гадоў (да 1999 г.) колькасць мужчын і жанчын зменшылася аднолькава – на 778 чалавек. Усяго па раёну колькасць жанчын на 1000 мужчын склала 1169 чалавек.

Па стану на пачатак 2002 года на Пастаўшчыне пражывала 21308 мужчын (45, 9 %) і 25064 жанчыны (54, 1 %). Як бачым, за апошні час розніца ў колькасці паміж прадстаўнікамі рознага полу зноў павялічылася, прычым, відавочна, за кошт пажылых узростаў. Калі ва ўзроставай групе 50 – 54 гадоў жанчын больш, чым мужчын на 139 чалавек, у групе 55 – 59 – на 244, то ў групе 65 – 69 – ужо на 794, 70 – 74 – на 818, а ў групе 75 – 78 – на 1556! З галоўных прычын такой з'явы можна назваць большую працягласць жыцця ў жанчын, на якую вызначальны ўплыў аказвае здаравейшы, чым у мужчын, лад жыцця, большая псіхалагічная ўстойлівасць да розных жыццёвых праблем.

Варта адзначыць, што ў некаторых узроставых групах мужчынскага насельніцтва больш, чым жаночага. Гэта назіраецца ў групах 5 – 19, 30 – 34 і 40 – 49 гадоў, прычым, найбольшая перавага мужчын назіраецца ў групе 15 – 19 гадоў – 218 чалавек.

У гарадскіх паселішчах пражывае 12049 мужчын і 14061 жанчына, у сельскіх – адпаведна 9259 і 11003.

## МЕХАНІЧНЫ РУХ НАСЕЛЬНІЦТВА. МІГРАЦЫІ

Міграцыі насельніцтва з'яўляюцца неадемнай часткай гісторыі нашага края. Практычна ўсе вядомыя іх віды – эканамічныя, ваенныя, рэпрэсіўныя, рэлігійныя, эпідэмічныя, палітычныя, этнічныя – прыйшлося паспытаць мясцоваму люду, хіба што толькі вялікія прыродныя катаклізмы не абрушваліся на нашу зямлю і не застаўлялі людзей адпраўляцца ў дарогу.

Першанасельнікі (угра-фіны, балты, славяне) засялялі Пастаўшчыну шляхам міграцый. Засяленне ішло пераважна з паўднёвых напрамкаў.

Разгледзім найбольш адметныя і значныя перамяшчэнні людзей за апошняе тысячагоддзе.

У канцы XIV – пачатку XV стагоддзяў на Пастаўшчыну перасяліліся першыя групы татараў і яўрэяў (падрабязней – у раздзеле "Плямёны і народы").

У 1654 – 1667 гадах край быў разрабаваны і папалены маскоўскімі войскамі, колькасць насельніцтва скарацілася амаль ўдвая, прычым частку жыхароў гвалтам пагналі ў Расію ў якасці палону.

Найбольш інтэнсіўны міграцыйны рух ахапіў Пастаўшчыну ў XX стагоддзі. Пасля бунту каля Лучайскага касцёла ў 1905 годзе у ваколіцы Лучая была перасялена значная група старавераў з глыбінных губерній Расіі.

У час імперыялістычнай вайны лінія фронта прайшла праз Паставы, падзяліўшы раён напалам. Пры вялікай канцэнтрацыі нямецкіх і рускіх войск мясцовае насельніцтва мусіла падавацца ў эміграцыю.

Эканамічна стагнацыя ў часы Польшчы прывяла крэсы ўсходнія да аграрнай перанаселенасці, што выклікала другую хвалю эканамічнай міграцыі (першая была ў канцы XIX стагоддзя).Людзі, пераважна моладзь, ехалі з нашага краю на заробкі ў Латвію, ЗША, Канаду, Аргенціну, Аўстралію. Большая частка з іх вярталася дамоў з грашыма, купляла зямлю, ладзіла гаспадарку, аднак рэшта асела ў далёкіх краінах, утварыўшы беларускую дыяспару. Некаторыя з мясцовых людзей пад уздзеяннем камуністычнай прапаганды пераходзіла ва ўсходнюю Беларусь.

Набліжэнне і пачатак другой сусветнай вайны выклікаў масавыя міграцыі насельніцтва. Значная частка палякаў з'ехала на

тэрыторыю этнічнай Польшчы, некаторыя жыхары раёна былі мабілізаваны ў польскае войска і, патрапіўшы ў палон, апынуліся ў Казельску ды Катыні.

Савецкая ўлада за няпоўныя два перадваенныя гады паспела правесці тры рэпрэсіўныя чысткі, у выніку якіх было вывезена на знішчэнне ці патрапіла ў канцэнтрацыйныя лагеры ад 500 да 1000 мясцовых жыхароў.

У час нямецкай акупацыі 1941 па 1944 год на тэрыторыі раёна знаходзілася шмат вайскоўцаў, прычым не толькі з Нямеччыны. Так, Пастаўскі гарнізон складаўся з 450 украінцаў, каля 500 літоўцаў і 70 нямецкіх салдат. У Варапаеве знаходзіліся каля 800 ваеннаслужачых вермахта. У Камайскім гарнізоне размяшчалася 117 чалавек (з іх 100 – з літоўскіх вайсковых частак і 17 – з літоўскай паліцыі), гарнізон Каралінова складаўся з 66 асоб літоўскай нацыянальнасці. Да 700 чалавек з ліку немцаў, украінцаў, латышоў і літоўцаў складалі аснову гарнізона Кашары. Каля сотні немцаў было ў Лынтупах, троху меней – у Груздаве, Дунілавічах, Залессі. У Ваўках і Перавозніках разам з немцамі неслі службу чэхі. У 1944 годзе ў Паставах размяшчаліся вайсковыя аддзелы Рускай вызваленчай арміі Ўласава. Агулам колькасць акупацыйных войск складала ў раёне каля 3500 – 4000 чалавек.

На захопленай тэрыторыі праводзілася карная палітыка ў дачыненні да мясцовага насельніцтва, асаблівая жорсткасць якой выявілася ў гвалце над яўрэямі і цыганамі.

Летам 1943 года у сувязі з праблемай недахопу працоўных рэсурсаў у Германіі, было прынята рашэнне аб мэтазгоднасці адпраўкі мірнага насельніцтва на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Пад час нямецкага “хапуна” з Пастаўшчыны ў рэйх на прымусовую працу было вывезена каля 2000 жыхароў. Многія з іх так і не вярнуліся на радзіму: некаторыя загінулі ад непасільнай працы і неўладкаванасці жыцця, а некаторыя засталіся на захадзе, асеўшы пазней на сталае жыццё ў Вялікабрытаніі, Францыі, Бельгіі, ЗША, Канадзе, Аўстраліі.

Пасля вайны адбываўся актыўны іміграцыйны працэс вяртання мясцовых жыхароў з войска, з палону, з выгнання. У далейшым міграцыйныя патокі стымуляваліся ў асноўным палітычнымі і сацыяльна-эканамічнымі прычынамі. Адразу пасля вайны, калі палякам была дадзена магчымасць выехаць у Польшчу, раён пакінулі 2487 чалавек. Значную долю складалі не этнічныя палякі, а беларусы-каталікі, якія былі “працятыя” польскім духам.

У сярэдзіне 50-х гадоў групы моладзі па так званых "камсамольскіх пуцёўках" адпраўлялася ў Карэлію (на асваенне Поўначы) і ў Казахстан (на асваенне Цаліны).

У 60 – 70 гадах у сувязі з будаўніцтвам прамысловых прадпрыемстваў і ростам гарадоў назіраўся рэзкі рост унутрырэспубліканскіх міграцый з сельскіх паселішчыў у гарадскія. З Пастаўшчыны ехалі пераважна ў Мінск, Наваполацк, Вілейку, Паставы. Разам з тым, у сувязі з мілітарызацыяй раёна і ператварэнні яе тэрыторыі ў адну з асноўных ракетных баз Савецкага Саюза, у Паставы і ваколіцы прыяжджала шмат вайскоўцаў розных нацыянальнасцей з усёй былой вялікай краіны.

Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя працэсы апошніх дзесяцігоддзяў адбіліся на характары і напрамках міграцыйных патокаў. У пачатку 80-х гадоў паказчыкі колькасці прыбыўшых у раён у гарадскую і сельскую мясцовасць выглядалі адносна стабільнымі: у гарадскія населеныя пункты прыяжджала за год у сярэднім троху больш за 1000 чалавек, у сельскія – ад 160 да 270. Колькасць выбыўшых была таксама адносна стабільнай, хаця з гарадскіх паселішчаў выяжджала менш, чым прыяжджала, а ў сельскія – амаль у два разы больш. Гэтыя факты сведчыць пра яшчэ існаваўшы адток сельскага насельніцтва ў гарады.

Аднак ужо ў сярэдзіне 80-х гадоў колькасць прыяжджаючых і выяжджаючых пачала імкліва павялічвацца: дэмакратызацыя і распад СССР, утварэнне незалежных дзяржаў паўплывалі на павышэнне рухомасці насельніцтва. Тым не менш, да 1988 года захоўвалася адмоўнае сальда міграцый ( з раёна выяжджала больш, чым прыяжджала).

У канцы 80-х сітуацыя з механічным рухам насельніцтва рэзка змянілася. У гарадскіх паселішчых колькасць прыбыўшых дасягнула 1868 чалавек у год і значна перавысіла лік з'ехаўшых, што дало сярэдні прырост у 1989 – 93 гадах каля 400 чалавек у год, дасягнуўшы паказчыка 585 чалавек у 1990 годзе. У сельскай мясцовасці лічбы былі больш сціплыя, але і там у гэтыя гады ішоў механічны прырост ад 113 (1989) да 466 (1992). Станоўчае сальда міграцый на той час вагалася каля адзнак 600 – 800 чалавек у год. Прычына такой зявы – дыферэнцыйны рух насельніцтва ў сувязі з утварэннем незалежных дзяржаў на абсягах былога СССР. На Пастаўшчыну асноўны міграцыйны паток ішоў з краін Балтыі, дзе ўзнікла моўная праблема для рускамоўнага насельніцтва, і з "гарачых кропак" Саюза – Грузіі, Арменіі, Азербайджана, Таджыкістана, Расіі.

З 1993 – 94 гадоў з прычыны разрастання і паглыблення эканамічнага крызісу ў Беларусі міграцыйны прырост змяніўся адтокам. Калі агульны паказчык сальда міграцый быў у 1992 годзе +840 чалавек, то ўсяго праз два гады ён ужо стаў (- 653).

На працягу апошніх гадоў агульны лік прыбыўшых вагаецца ад 1100 да 1300 чалавек, выбыўшых – ад 1300 да 1600, з прычыны чаго захоўваецца адмоўнае сальда механічнага прыросту насельніцтва. З 1995 па 2000 год яе велічыня панізілася з – 25 да – 192 чалавек у год.

У першай палове 2002 года ў раён прыехала на 34 чалавекі больш, чым выехала з яго (339 супраць 305). У Паставах прырост за паўгода склаў 50 чалавек (231 – 181), у Варапаеве +4, у Лынтупах – 2.

Разгледжаныя лічбы паказваюць, што міграцыйныя патокі апошніх гадоў у асноўным стабілізаваліся з тэндэнцыяй нязначнага адтока насельніцтва з раёна. Разам з тым бачна, што вёска, як крыніца росту гарадскага насельнаіцтва, ўжо вычарпала свае рэсурсы і значна ўплываць на змяненні колькасці гарадскага насельніцтва ўжо не можа.

## ШЧЫЛЬНАСЦЬ І РАЗМЯШЧЭННЕ НАСЕЛЬНІЦТВА

Паказчыкі сярэдняй шчыльнасці насельніцтва ў раёне цесна звязаны з яго колькасцю: пры павелічэнні ліку жыхарства шчыльнасць таксама павялічвалася, пры памяншэнні – змяншалася.

У пачатку II тысячагоддзя нашай эры шчыльнасць насельніцтва на Пастаўшчыне была каля 1, 5 чалавек на км$^2$. Перад вайной Рэчы Паспалітай з Масковіяй у сярэдзіне XVII стагоддзя яна дасягнула 12 чал / км$^2$, аднак пасля гэтай вайны, як і пазней пасля руска – шведскай вайны ў 1711 годзе, гэты паказчык знізіўся да 4, 5 чал / км$^2$.

Максімальнага значэння шчыльнасць жыхарства ў нашым краі дасягнула перад першай сусветнай вайной – 53, 3 чал / км$^2$, троху меншая велічыня была перад другой сусветнай – 48, 1 чал / км$^2$.

З 60-х гадоў XX стагоддзя назіраецца змяншэнне шчыльнасці насельніцтва: у 1970 годзе – 29, 6 чал / км$^2$, у 1989 – 23, 7 чал / км$^2$, у 2002 – 22 чал / км$^2$.

У сучаснай Беларусі гэты паказчык мае значэнне 47, 7 чал / км$^2$, з чаго вынікае, што наш край заселены людзьмі амаль у 2 разы радзей, чым у сярэднім па краіне. Прычыны змяншэння шчыльнасці звязаны з адмоўнымі паказчыкамі натуральнага прыроста і механічнага руху (міграцый).

Насельніцтва Пастаўшчыны размешчына нераўнамерна. У старажытныя часы засяленне ішло па далінах рэк і берагах азёр, у той час як вадападзелы заставаліся амаль некранутымі. У канцы каменнага века і ў раннім сярэднявеччы з развіццём земляробства і жывёлагадоўлі пачалі засяляцца ўзвышшы і лагчыны Свянцянскіх градаў, выспы сярод лясоў і балотаў.

На сённяшні дзень можна вызначыць некалькі характэрных асаблівасцей размяшчэння насельніцтва ў нашым раёне. Па-першае, выдзяляецца паласа павышанай шчыльнасці. Яна праходзіць з захаду на ўсход ад Лынтупаў – Палесся праз Камаі – Мягуны, Паставы – Манькавічы, Лучай – Стары Двор, Дунілавічы – Варапаева да Казлоўшчыны – Навадруцка – Ваўкоў. Працягласць паласы складае каля 80 км, шырыня яе вагаецца ад 8 да 15 км. Тут размешчаны ўсе гарадскія пасёлішчы (Паставы, Лынтупы, Варапаева) і амаль усе буйныя вёскі. Шчыльнасць насельніцтва перавышае сярэднераённы паказчык, у асобных мясцовасцях дасягаючы сярэднебеларускіх значэнняў (каля 50 чал на км$^2$). Паласа павышанай шчыльнасці геаграфічна супадае са Свянцянскімі градам, дзе ў паніжэннях паміж узгоркамі маецца даволі ўрадлівай зямлі і, што асабліва важна для нашай мясцовасці, яна пазбаўлена празмернага ўвільгатнення.

Па-другое, у паўночнай частцы раёна, на Падзісеншчыне, можна выдзеліць тыпова далінны тып рассялення. Сапраўды, абсалютная большасць вёсак месціцца ўздоўж рэк Дзісны, Мядзелкі, Лучайкі, Паловіцы, Голбіцы. На абсягах паміж рачнымі далінамі вёсак вельмі мала, насельніцтва рэдкае. На характар рассялення ў паўночнай частцы раёна ўплывае вялікая забалочанасць і лясістасць тэрыторыі. Практычна не мае сталага жыхарства глухі лясны масіў Гадуцінская Дача. Варапаеўская лясная Дача таксама не населена, але тут прычына не толькі прыродная, але і сацыяльная: раней у гэтым месцы знаходзіўся вайсковы палігон. Вялікія слабазаселеныя масівы забалочанага лесу цягнуцца ад Гуты да Мосара. У паўночнай частцы раёна знаходзяцца толькі чатыры вялікія вёскі: Кураполле, Васіліны, Полава і Белькі.

Па-трэцяе, у паўднёвай частцы Пастаўшчыны, дзе знаходзяцца вярхоўі рэк Страчы, Лучайкі, Смычыцы, Заражанкі; азёры Швакшты Вялікія і Малыя, Лучайскае, Лісіцкае, мясцовасць таксама моцна забалочана, пакрыта лесам і таму слаба заселена. Аднак асобныя, значныя па памерах, узвышшы заселены даволі шчыльна. Гэта ваколіцы вёсак Вярэнькі, Груздава, Сяргеевічы.

Па-чацвертае, усе большыя паселішчы нашага края выраслі каля рэк і азёр, а самыя вялікія – у месцах, дзе азёрныя групы размяшчаюцца каля рэк (Паставы, Дунілавічы, Варапаева, Гута).

У бліжэйшыя дзесяцігоддзі, напэўна, будзе працягвацца працэс памяншэння шчыльнасці насельніцтва ў сувязі з агульным дэмаграфічным крызісам, а малюнак размяшчэння насельніцтва будзе змяняцца ў бок канцэнтрацыі жыхароў у горадзе, гарадскіх паселішчах і буйных вёсках, пры паступовым знікненні невялікіх вёсак і хутароў.

## ВЕРАВАННІ І РЭЛІГІІ

Да пачатку ІІ тысячагоддзя нашай эры мясцовае насельніцтва верыла ў звышнатуральныя сілы духаў зямлі, мела свой пантэон багоў, пакланялася дрэвам ды камяням, прыносіла ахвяры на агні ды на вадзе. Візантыйскі пісьменнік Пракопій Кесарыйскі (6 ст. н.э.) пісаў пра вераванні славян:”... лічаць, што адзін толькі бог, тварэц маланкі, з’яўляецца ўладыкай над усімі, і яму прыносяць у ахвяру быкоў і спраўляюць другія свяшчэнныя абрады...Яны шануюць рэкі, і німф, і ўсялякія іншыя бажаствы, прыносячы ахвяры ўсім ім і пры дапамозе гэтых ахвяр робяць і гаданне...”[20, с. 9]

Паганскія вераванні існавалі доўгі час побач з хрысціянствам і іншымі канфесіямі, захаваліся яны і да пачатку ІІІ тысячагоддзя нашай эры. Прыкладам таму можа быць Святы (Дзіравы) камень каля вёскі Каптаруны, да якога да нядаўняга часу насілі ахвяраванні некаторыя мясцовыя жыхары. Прычым, апошнім часам да паганства , як сістэмы светагляду, назіраецца павышаны інтарэс з боку адукаванай моладзі. На Пастаўшчыне ў незалежных выданнях з’явіўся шэраг артыкулаў паганскага накірунку, падрыхтаваны часопіс “Ліхалессе”.

Але ўсё ж дамінуючыя пазіцыі ў рэлігійным жыцці раёна займае хрысціянства, якое прадстаўлена каталіцызмам, праваслаўем і пратэстантызмам.

Гістарычныя звесткі пра тое, якое адгалінаванне хрысціянства першым пусціла карані на Пастаўшчыне, адсутнічаюць. На наш погляд, хоць гэта рэлігія трапіла на славянскія землі з Візантыі і ў пачатку ІІ тысячагоддзя адбываўся працэс хрышчэння насельніцтва ў Полацкім княстве, наша мясцовасць, напэўна, яшчэ доўгі час знаходзілася ў паганстве, бо, як вядома, хрышчэнне Літвы адбылося на 400 гадоў пазней за Полаччыну. Верагодна, далучэнне мясцовага насельніцтва да хрысціянства адбылося пасля Крэўскай уніі, калі

Вялікі князь Літоўскі Ягайла, стаўшы каралём Польшчы, у сваёй грамаце 1387 года абʼявіў аб прымусовым абарачэнні ў каталіцтва паганскага насельніцтва края. У хуткім часе пасля гэтага на Пастаўшчыне і ў ваколіцах пачалі будавацца касцёлы: у Свянцянах ў 1414 годзе, Свіры – 1452, Лынтупах – 1459, Груздаве – 1443 і, верагодна, у іншых паселішчах.

XVI стагоддзе, асабліва маскоўскае нашэсце 1567 года прынесла вялікае гора і страты мясцоваму жыхарству, паўплывала на рэлігійныя дачыненні. Абсалютная большасць драўляных касцёлаў была разрабавана і папалена. Таму эканамічны рост у канцы XVI – першай палове XVII стагоддзяў прывёў да пашырэння каталіцтва, што адлюстравалася ў будаўніцтве новых касцёлаў: 1606 – у Камаях, 1610 – у Паставах, 1624 – у Дунілавічах. У 1640 годзе на выспе Гарадзішча ў Паставах быў пабудаваны кляштар францысканцаў з касцёлам.

Разам з тым, у нашай мясцовасці ў гэты час пачынае пашырацца уніяцтва. У 1595 годзе была заключана Брэсцкая царкоўная унія паміж праваслаўем і каталіцызмам. Згодна з ёй Вялікі князь ВКЛ Жыгімонт IV Ваза выдаў дэкрэт аб зліцці цэркваў. Такім чынам утварылася уніяцкая, “народная” царква. У інвентары маёнтка Паставы ад 1628 года згадваецца “царква пад тытулам святого Мікалая з усім начыннем”.

Трэцяя хваля будаўніцтва касцёлаў прыпадае на другую палову XVIII стагоддзя. Тады ўзніклі каталіцкія храмы ў Лучаі ў 1776 годзе, Дунілавічах – 1769-73; зроблена прыбудова капліцы са склепам да касцёла ў Камаях (1778 г.).

У XVIII - XIX стагоддзях будаваліся і цэрквы, пераважна уніяцкія: 1756 г. – Груздава, 1713 г.- Паставы, 1782 г. – Асінагарадок, 1817 г. – Рымкі, 1830 г. – Ласіца.

Мясцовае насельніцтва заўсёды вызначалася верацярпімасцю, аднак дзяржаўныя ўлады ў розныя часы праводзілі сваю палітыку ў дачыненні да рэлігій, спрыяючы якой-небудзь адной і абмяжоўваючы другія. Да падзелу Рэчы Паспалітай у канцы XVIII стагоддзя прыярытэтнай рэлігіяй быў каталіцызм. У 1658 годзе сойм краіны нават прыняў закон аб выгнанні з краю кожнага, хто адмаўляўся ад каталіцкай веры.

Пасля пераходу тэрыторыі ў склад Расіі змянілася рэлігійная палітыка. Царскі ўрад актыўна падтрымліваў праваслаўе, адначасова абмяжоўваючы правы католікаў і касцёла. У 1839 годзе была скасавана унія, і уніяты дзе дабраахвотна, а дзе і гвалтам былі далучаны да праваслаўя, а абсалютная большасць уніяцкіх храмаў

пераўтворана ў праваслаўныя. Такім чынам, XIX стагоддзе прайшло пад знакам пастаяннага пашырэння ўплыву праваслаўя.

У міжваенным часе XX стагоддзя, калі Пастаўшчына апынулася ў складзе Польшчы, палітыка паланізацыі праводзілася ў цесным суладдзі з дзеяннямі большай часткі каталіцкіх святароў. Не дзіўна, што ўжо ў 1935 годзе палова насельніцтва Пастаўшчыны запісвалася палякамі, г. з. беларусамі-католікамі.

Пасляваенны час да 80-х гадоў характарызаваўся нашэсцем ваяўнічага атэізму: праводзілася масавая апрацоўка насельніцтва ў духу бязбожніцтва; храмы зачыняліся і апаганьваліся, будаваўся камунізм. Пастаўскі касцёл быў ператвораны ў філіял завода радыёкампанентаў, у касцёлах Лучая і Дунілавічаў вецер ганяў пыл, паўсюль валялася смецце, бітая цэгла, тынкоўка; у Манькавіцкай царкве, ад якой захаваліся толькі сцены, на месцы алтара расло дзікае дрэва. І гэта толькі асобныя прыклады.

Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага ладу ў СССР у 80-я гады прывяла да ажыўлення грамадскай ініцыятывы ў першую чаргу ў вернікаў. Шляхам зацятай, а часам і драматычнай барацьбы з уладамі, ім удалося дабіцца аднаўлення храмаў у Паставах, Дунілавічах, Лучаі, Манькавічах, Груздаве і іншых населеных пунктах. Работы па будаўніцтву і аднаўленню храмаў працягваюцца і зараз.

У 2001 годзе паміж праваслаўем і каталіцызмам на Пастаўшчыне існаваў парытэт: абедзьве галіны хрысціянства мелі па 7 таварыстваў. Праваслаўныя рэлігійныя суполкі дзейнічалі ў Паставах, Варапаеве, Ваўках, Манькавічах, Груздаве, Асінагарадку, Ласіцы; каталіцкія – у Паставах, Варапаеве, Лынтупах, Дунілавічах, Лучаі, Груздаве, Камаях. Размяшчэнне гэтых таварыстваў мае пэўныя заканамернасці. Так, можна гаварыць пра каталіцкі захад (Лынтупшчына, Камайшчына) і праваслаўна-каталіцкі ўсход (Пастаўшчына, Варапаеўшчына), прычым, як гэта ўжо было паказана вышэй, адрозненні паміж гэтымі двумя часткамі раёна прасочваюцца не толькі ў рэлігійных адносінах, але і ў прыродных ды этнічных асаблівасцях.

Пры захаванні трывалых пазіцый дзвюх традыцыйных галін хрысціянства, разам з тым паступова пашыраецца ўплыў пратэстантызму, які ў нашай мясцовасці праяўляецца ў павелічэнні колькасці прыхільнікаў царквы хрысціян веры евангельскай. Маючы падтрымку аднаверцаў, пераважна з краін Скандынавіі, прадстаўнікам гэтай галіны хрысціянства ўжо ўдалося стварыць свае таварыствы ў Паставах (“Выратаванне” і “Абуджэнне”), у Камаях (“Новае жыццё”), у Варапаеве.

Хрысціянства прадстаўлена на Пастаўшчыне і яшчэ адной плынню – стараабрадчай, або староверскай царквой. Гэта адгалінаванне праваслаўя ўзнікла пасля расколу ў рускай праваслаўнай царкве ў другой палове XVII стагоддзя. Ратуючыся ад праследу, стараверы уцякалі з цэнтральнай часткі Расіі цэлымі вёскамі. Частка з іх знайшла прытулак у талерантным Вялікім Княстве (Рэчы Паспалітай), у тым ліку і на Пастаўшчыне. Асноўны арэал іх кампактнага пражывання – гэта паўночная Лынтупшчына. Менавіта там і знаходзяцца два стараабрадчыя храмы ў Апідамах і Куклянах. Яны – помнікі драўлянага дойлідства пачатку XX стагоддзя.

Яшчэ адна мясцовасць, дзе пражываюць стараверы, гэта Лучайшчына. А патрапілі гэтыя людзі сюды не ў часы расколу, а ў пачатку мінулага стагоддзя. Паводле народнага верша “Кірха”, пасля бунту мясцовых жыхароў каля лучайскага касцёла, расійскі чыноўнік барон Клейгіс, які быў тутэйшым землеўладальнікам, для “разбаўлення” мясцовага каталіцкага насельніцтва перасяліў з глыбіні Расіі старавераў-кацапаў, нашчадкі якіх і да сёння жывуць у ваколіцах Лучая. Да лета 1943 года ў мястэчку знаходзілася староверская царква з вялікім купалам. Яна згарэла пад час сутыкнення паміж немцамі і партызанамі.

Напачатку XXI стагоддзя нехрысціянскіх рэлігійных таварыстваў не зарэгістравана, аднак ёсць асобныя невялікія групы насельніцтва, якія з’яўляюцца прадстаўнікамі іншых рэлігій. Найбольшымі адметнасцямі сярод іх выдзяляюцца татары і яўрэі.

Татары, якія з’явіліся на Пастаўшчыне на рубяжы XIV – XV стагоддзяў, карысталіся беларускай мовай, але захоўвалі мусульманскую веру. Мясцовыя мусульмане веравызнавалі іслам суніцкага толку ( “суна” па-арабску “звычай”, сінонім слову “Хадіс”, паданне пра Мухамеда). Суніты лічаць законнымі спадчыннікамі Мухамеда трох легендарных халіфаў - Абу-Бекера, Амара і Асмана – і таму прызнаюць толькі тыя паданні пра прарока (суны), якія ўзніклі пры іх.

Рэлігійным цэнтрам мясцовых татараў доўгі час быў Мядзел, дзе знаходзілася мячэць. Каля Мядзела на паўвыспе возера Мястра месцяцца вялікія татарскія могілкі (мізар), дзе побач з сучаснымі пахаваннямі знаходзяцца (асабліва бліжэй да возера) вельмі старажытныя, ад якіх захаваліся толькі надмагільныя камяні. Можна меркаваць, што мізар існуе з часу пасялення татараў на нашых землях.

Яшчэ адна нацыянальная меншасць – яўрэі – прытрымліваецца сваёй веры – іудаізма. Прадстаўнікі гэтага народа патрапілі на нашы

землі амаль у тыя ж часы, што і татары, аднак, у адрозненні ад іх, колькасць яўрэяў пастулова павялічвалася за кошт натуральнага прыросту і міграцый. У другой палове XIX стагоддзя доля яўрэяў у асобных мястэчках Пастаўшчыны складала ад 30 да 60 %. Яны мелі свае культавыя будынкі. Так, паводле даведніка "Воласці і важнейшыя пасяленні еўрапейскай Расіі" за 1886 год у Паставах знаходзілася сінагога і яўрэйскі малітоўны дом. Яўрэйскія культавыя будынкі знаходзіліся і ў іншых мястэчках. Гэты народ моцна пацярпеў пад час першай і, асабліва, другой сусветнай вайны. У пасляваенным часе колькасць яўрэяў на Пастаўшчыне пастулова змяншаецца.

## ПЛЯМЁНЫ І НАРОДЫ

Этнічную прыналежнасць старажытнага насельніцтва Пастаўшчыны вызначыць немагчыма з прычыны адсутнасці звестак. Можна толькі сцвярджаць, як гэта робяць археолагі, што першымі насельнікамі нашай зямлі былі індаеўрапейцы. Жыццё і побыт у пэўных прыродных умовах паўплывалі на дыферэнцыяцыю элементаў матэрыяльнай культуры і фармаванне мовы. Гэтыя праявы даўнейшай дзейнасці людзей даследуюцца археолагамі і лінгвістамі-тапанімістамі. Першыя выдзяляюць на тэрыторыі раёна шэраг археалагічных культур (порыстай керамікі, грабеньчата-ямкавай керамікі), другія фіксуюць адметнасці і асаблівасці назваў рэк, азёр і паселішчаў, якія дайшлі да нашых часоў з глыбокай даўніны.

Сукупнасць звестак прыводзіць да высновы, што першае сталае жыхарства раёна (каменны век) належыла да плямёнаў угра-фінскай моўнай сям'і. На Пастаўшчыне захавалася шмат гідронімаў – назваў рэк і азёр, якія маюць тапанімічную радню ў эстонскай, фінскай, комі, комі-пярмяцкай і іншых роднасных мовах, і сэнс якіх з вялікай доляй верагоднасці тлумачыцца з гэтых моў: Камайка, Шурыца, Янка, Швакшты, Лодасі, Тузьбіца, Чарты, Чэртка і да т. п.

Складана вызначыцца з тым, якія плямёны насялялі нашу зямлю. Можна толькі выказаць меркаванне, што імі былі нальшчаны з арэалам пражывання на Лынтупшчне і Камайшчыне, і лота, або лотва, - возера і вёска з такой назвай знаходзяцца на мяжы Пастаўскага і Мядзельскага раёнаў [5, с.18]. У Падзісеншчыне, напэўна, жылі іншыя плямёны, але вызначыцца з іх назвамі немагчыма. Можна вылучыць версію, што гэта былі родзічы эстаў. Параўнаем назву сталіцы Эстоніі "Тал-лінн" і назвы вёсак Пастаўскага края "Васі-ліны", "Міха-ліна", "Іда-ліна", "Кара-лінова". Ёсць гукавое

падабенства. А “лінна” ў эстонскай мове азначае “замак”, “умацаванае месца”. Нашы “ліны” знаходзяцца ў такіх месцах, дзе прырода сама прапаноўвала стварыць умацаваныя паселішчы. Можа гэта і так, але пакуль што існуе як версія.

Паводле даследванняў археолагаў, у канцы каменнага веку на Пастаўшчыну з захаду і паўночнага захаду прасунуліся плямёны культуры шнуравой керамікі, або баявых сякер, якіх адносяць да прадстаўнікоў прабалцкага этнасу. У выніку адбылася частковая асіміляцыя мясцовага угра-фінскага насельніцтва. Балцкі ўплыў заўважны і ў тапаніміцы, асабліва ў заходняй частцы раёна, на Лынтупшчыне. Назвы рэк Пеляка і Лынтупка, вялікая колькасць балцкіх канчаткаў: Гудэлішкі, Пяскарышкі, Шчэрбішкі, Цырклішкі, Варкацішкі, Баранішкі і да т. п.

Такім чынам, на Пастаўшчыне да сярэдзіны I тысячагоддзя нашай эры пражывала змешанае угра-фінскае і балцкае насельніцтва.

У VI – VIII ст. н. э. на нашу тэрыторыю пачалося пранікненне славянаў. Яны рассяляліся на водападзелах і па далінах рэк, паступова асімілюючы мясцовае насельніцтва. Рух славянаў адбываўся з усходу або з паўночнага усходу на захад, але дасягнуўшы ракі Мядзелкі ён прыпыніўся на доўгі час. Нават і зараз Лынтупшчына і Камайшчына моўна, побытава, этнаграфічна, культуралагічна адрозніваюцца ад уласна Пастаўшчыны і Варапаеўшчыны. Паводле звестак гісторыка С. Д. Фёдарава, ужо ў 996 годзе на месцы сучасных Паставаў існавала невялікае паселішча Пасаднік – памежнае ўмацаванне Полацкага княства [7, с.1].

Этнічныя працэсы прывялі да фармавання беларускага этнасу, які набыў свае адметныя рысы ў часы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Росквіт дзяржавы ў XIII – XV стагоддзях, адносная стабільнасць у грамадскіх стасунках спрыяла этнічнай кансалідацыі мясцовага насельніцтва.

Існуе рамантычная версія аб прысутнасці скандынаўскага элемента ў фармаванні мясцовага насельніцтва Лынтупшчыны. Яна грунтуецца на тапанімічных асаблівасцях і наяўнасці значнай колькасці валуноў-ахвярнікаў.

Саманазоў шведаў – “свены” (прыгадаем назву самай вядомай шведскай газеты “Свенска Дагбладэт”), а спалучэнні гукаў “св“, “жв”, “шв” уласціва скандынаўскім мовам. Мы ж на Лынтупшчыне і ў ваколіцах сустракаем назвы: Свірплішкі, Свірдуны, Свіраны, Свянцяны (!), Швакшты, Жвойрышкі, Жвірблішкі… А пра ахвярнік-валун Дзіравы (Святы) камень, якому прыносяць ахвяраванні і да

сёння, вядома ўжо ўсім спецыялістам. Можа ваяўнічыя вікінгі-скандынавы трымалі на мяжы стагоддзяў тут сваю калонію? Можа і сапраўды каля вёскі Каптаруны (дарэчы, недалёка ад Дзіравага каменя) нас чакаюць рунічныя пісьмёны старажытных скандынаваў?

Калі версія прысутнасці вікінгаў у гісторыі нашай зямлі з'яўляецца пакуль што дужа-дужа рамантычнай, то наяўнасць татараў прасочваецца з глыбокай даўніны да сённяшніх дзён. Прадстаўнікі гэтага народу пратрапілі на Пастаўшчыну верагодна ў канцы XIV стагоддзя, калі князь Вітаўт здзейсніў свой паход у Кіпчацкія стэпы, прайшоў за Дон да Волгі і, ўварваўшыся ў галоўнае ардынскае качэўе, узяў у палон тысячы татараў з сем'ямі, якіх потым рассяліў па Літве. Паводле І. Быхаўца, маёнтак Вітаўта быў у Цырклішках каля Свянцянаў і ён пасяліў татараў у вёсках на ўсход ад рэзідэнцыі: у Жардэлях, Субачах, Яўнелішках і некаторых іншых [3, с. 23]. Не выключана, што частка з іх былі вольнымі, з тых татараў, якія дабраахвотна перайшлі на службу да Вітаўта. Службовая татарская знаць атрымала шляхецкія правы і ператварылася паступова ў феадалаў (татар-зямян), уладальнікаў маёнткаў, фальваркаў, вёсак. Рэшта ж перасяленцаў стала звычайнымі хлебаробамі, асела ў гарадах і мястэчках, займалася вырабам скур, меднага посуду, рамізніцтвам і да т. п. У Паставах да сённяшняга часу захавалася гістарычная назва месца, дзе татары займаліся апацоўкай скур – Гарбарка.

Паколькі татарам было дазволена браць у жонкі мясцовых дзяўчат, то паступова адбывалася асіміляцыя татарскага насельніцтва, славянізаваліся рысы твару, мяняўся побыт, роднай мовай станавілася беларуская.

У сярэдзіне XIX стагоддзя ў Паставах пражываў 21 прадстаўнік гэтага народа. Да татарскіх прозвішчаў можна аднесці наступныя: Мухля, Палтаржыцкі, Гімбіцкі, Якубоўскі, Кірэй, Мурза, Александровіч, Асановіч, Ільясевіч, Лебедзь, Тамашэвіч.

З часамі княжання Вітаўта звязана і з'яўленне ў нашай мясцовасці яўрэяў. У XIV – XVстагоддзях адбылася масавая эміграцыя прадстаўнікоў гэтага народа на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага з заходніх краін, пераважна з Нямеччыны, дзе супраць яўрэяў чыніўся цяжкі ўціск і гвалт (асабліва пасля крыжовых паходаў). Талерантныя адносіны да розных рэлігій і народаў у ВКЛ паспрыялі хуткай адаптацыі імігрантаў і ўключэнню іх у гаспадарча-гандлёвыя стасункі як ўнутры краіны, так і за яе межамі. Яны мелі свабодны доступ да рамяства, ім дазвалялася гандляваць у хрысціянскія святы, надаваліся такія ж правы, як і мяшчанам. Ужо ў пачатку XVI стагоддзя яўрэі занялі значную вагу ў эканоміцы ВКЛ.

Яны набывалі зямлю, рабіліся адкупшчыкамі пэўных падаткаў і збораў у вялікакняскую скарбонку. Заможныя яўрэі давалі ў водкуп бяднейшым крамы, шынкі, корчмы. Пражывалі яны кампактна кагаламі (яўрэйскімі абшчынамі) у гарадах і мястэчках, на пасяленне ў якіх яны мелі дазвол. На Пастаўшчыне ў другой палове XIX стагоддзя яўрэі мелі права сяліцца ў пяці мястэчках: Паставы, Дунілавічы, Камаі, Лынтупы, Лучай (з 1858 г.). У 1882 годзе да гэтага спіса далучана мястэчка Манькавічы.

У Паставах у сярэдзіне XIX стагоддзя з агульнай колькасці жыхароў (1586 чалавек) яўрэяў было 925, або 58%. У Лынтупах, паводле звестак перапісу 1897 года, з 685 жыхароў яўрэяў пражывала 238 (35 %), у Камаях – з 622 насельнікаў – 155 яўрэяў ( 25 %), у той час, як доля прадстаўнікоў гэтага народа ва ўсім Свянцянскім павеце складала тады 7 % .

Вялікія страты панёс яўрэйскі народ у час першай і, асабліва, другой сусветнай вайны. У 1941-42 гадах у Паставах, Дунілавічах, Лынтупах фашысты стварылі канцэнтрацыйныя лагеры (гета) для яўрэяў. У іх было ссялена амаль усё яўрэйскае насельніцтва Пастаўшчыны, большая частка якога пазней была расстраляна. У Пастаўскім гета знішчана каля 4 тысяч, у Дунілавіцкім – 828, у Лынтупскім – 242 чалавекі. Агульныя страты склалі каля 5000 жыхароў. У пасляваенны час колькасць яўрэяў на Пастаўшчыне пастаянна скарачаецца з прычыны нізкага натуральнага прыросту і эміграцыі за межы Беларусі, пераважна ў Ізраіль.

Калі з'явіліся на Пастаўшчыне рускія (маскоўцы, маскалі, русакі, русіны) сказаць дакладна немагчыма. У нашым краі ёсць вёскі з назвамі Маскалішкі, Русакі, Русіны, што сведчыць пра кампактнае пражыванне рускіх людзей ў асяродку беларусаў, прычым назва "Русіны" падкрэслівае праваслаўную адметнасць жыхароў у асяроддзі католікаў. Паколькі гэтыя вёскі знаходзяцца ў даліне ракі Мядзелкі, па якой у старажытнасці праходзіў водны гандлёвы шлях, то вельмі верагодна, што месцы кампактнага пражывання русінаў маглі ўзнікнуць у раннім сярэднявеччы. Прычым, тапонім "маскалішкі" мог мець і старажытнае мясцовае паходжанне, бо ён (як і "Масква") утвораны ад угра-фінскай асновы "маск" і знаходзіцца на нашай тэрыторыі ў акружэнні іншых тапонімаў гэтай моўнай сям'і (Бірвіта, Мамулі, Коскі, Койры, Свілы).

Рассяленне рускіх (маскоўцаў) на Пастаўшчыне ў XVI – XVII стагоддзях малаверагодна, бо Рэч Паспалітая вяла працяглыя войны з Маскоўскай дзяржавай, а тое пекла, якое ўчынілі на нашай зямлі рускія захопнікі пад час вайны 1654 – 1667 гадоў, калі было знішчана

(па розных ацэнках) ад траціны да паловы жыхароў, сфармавалася трывалае стаўленне мясцовага насельніцтва да маскалёў як да ворагаў.

Толькі ў канцы XVII – пачатку XVIII стагоддзя на Пастаўшчыне пасяліліся на сталае жыхарства значныя групы ўцекачоў з Масковii. Гэта маскалі-стараверы, гнаныя рэлігійнай нецярпімасцю з Расii, знайшлі прытулак на нашай зямлі. Яны пасяляліся ў найменш асвоеных частках раёна ў мясцовасці, дзе зараз знаходзяцца вёскі Апідамы, Палессе, Кукляны, Белькі. Арыгінальныя асаблівасці мовы, побыту і традыцый захаваліся ў гэтых мясцовасцях да нашых дзён.

Колькасць рускіх нязначна павялічвалася ў XIX стагоддзі за кошт расійскіх чыноўнікаў і праваслаўнага духавенства, якія праводзілі дзяржаўную імперскую палітыку на далучаных да Расii тэрыторыях.

У пачатку XX стагоддзя на Пастаўшчыне з'явілася яшчэ адно месца кампактнага пражывання рускіх: пасля бунту каля лучайскага касцёла з расійскай глыбінкі прымусова былі прывезены і расселены ў ваколіцах Лучая стараверы-кацапы, якія, у адрозненні ад апідамскіх старавераў, у значна большай ступені асіміляваліся мясцовым насельніцтвам.

Гістарычныя варункі склаліся так, што доля рускіх у насельніцтве раёна да 1939 года не перавышала 1 % .

Дзесці з XVII стагоддзя можна выяўна прасачыць сітуацыю з пашырэннем і паглыбленнем этнічнага ціску іншых народаў на мясцовае насельніцтва. Да другога падзелу Рэчы Паспалітай (1792 г.) праводзілася палітыка паланізацыі беларусаў. Яна ахапіла вышэйшыя адукаваныя слаі жыхарства, у той час як вясковае насельніцтва захоўвала сваю тутэйшасць. Пасля пераходу Пастаўшчыны ў склад Расійскай імперыі паланізацыя змянілася русіфікацыяй. Падтрымка напалеонаўскага войска, удзел насельніцтва ў паўстаннях 1830-31 гадоў і 1863 года, падрыхтоўка да паўстання 1848-49 гадоў – вось рэакцыя мясцовага жыхарства на расійскую палітыку на далучаных землях. Царскі ўрад разумеў, што паспяховая русіфікацыя можа быць праведзена , калі ёй будзе ахоплена не толькі эліта грамадства, але і ўсе групы жыхарства. Новы падыход быў сфармуляваны віленскім генерал-губернатарам М. М. Мураўёвым: “То, что не сделал русский штык, сделает русская школа і русский чиновник”.

Аднак, асвета і адукацыя ахапілі нязначную частку насельніцтва – пераважна непісьменныя вёскі спрэс размаўлялі на “белоруском наречіе” (так засведчана ў рукапісных матэрыялах пра Пастаўскую, Манькавіцкую, Норыцкую, Камайскую і іншыя воласці). У той жа час,

пашырэнне ведаў прывяло да росту самасвядомасці і паспрыяла ўзнікненню літаратурнай беларускай мовы.

Пасля першай сусветнай вайны Пастаўшчына патрапіла ў склад Польшчы і русіфікацыя змянілася на паланізацыю. Польскія ўлады дзейнічалі тымі ж метадамі, што і расійскія. Урадавая палітыка праводзілася выхадцамі з этнічнай Польшчы: кіраўнікамі гмінных адміністрацый, акцызнымі і падатковымі чыноўнікамі, секвестарамі, каморнікамі, леснікамі. Паўсюдна пры дзяржаўнай падтрымцы адчыняліся польскія школы. Таму не дзіўна, што паводле перапісу 1931 года ў Пастаўскім павеце палякі складалі 49 %, беларусы – 48 %, астатнія з'яўляліся прадстаўнікамі нацыянальных меншасцей (рускія і яўрэі). Трэба заўважыць, што палякамі звычайна пісаліся беларусы-католікі, а беларусамі і рускімі - праваслаўныя беларусы.

Цікавыя метамарфозы адбываюцца ў нацыянальным складзе насельніцтва ў 1939-41 гадах. Паводле звестак упаўнаважанага ЦК КП(б)Б па Пастаўскім павеце Брыкава ад 10 снежня 1939 года, на нашай тэрыторыі пражывала 46 % беларусаў, 52 % палякаў; яўрэяў, рускіх і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей – 2 %. Праўда, у дакуменце зроблена заўвага: "по далеко не точным данным"[12, с.171]. Аднак, як бачым, дадзеныя мала адрозніваюцца ад звестак перапісу 1931 года, хіба што пабольела палякаў і паменела беларусаў.

І вось усяго праз год (дадзеныя з пашпарта апісання Пастаўскага раёна на 1 студзеня 1941 года) лічбы кардынальна мяняюцца: беларусаў – 88 %, палякаў – 2 % (?!), яўрэяў – 4 %, рускіх – 3 %, іншых – 3 %.. Уражвае рэзкае змяншэнне колькасці палякаў: напрыканцы 1939 года яны складалі больш паловы насельніцтва, а ў пачатку 1941 іх ужо менш, чым рускіх ды яўрэяў. Чаму? Прычынай такой метамарфозы магла быць палітычная сітуацыя таго часу: Польшча ў 1939 годзе "па-братэрску" была падзелена паміж СССР і Германіяй, і як дзяржава перастала існаваць; Польшча ваявала з "саветамі" і палякі аўтаматычна былі ворагамі новай улады; нарэшце, камуністычная прапаганда ды страх зрабілі сваю справу. Паводле гісторыка Міколы Іванова, у 1936-38 гадах у СССР "палякі абвяшчаюцца ворагам нумар адзін. Пачынаецца неспатыкальнае ў гісторыі чалавецтва праследванне беларускіх католікаў, большасць з якіх кіруецца ў напрамку шматлікіх на Беларусі мясцовых "Курапатаў", а слова "паляк" становіцца сінонімам ворага савецкай улады"[9, с.3].

Пасля другой сусветнай вайны паміж урадам БССР і Польскім камітэтам нацыянальнага вызвалення была падпісана дамова аб узаемнай эвакуацыі беларусаў з Польшчы і палякаў з БССР у

Польшчу. На выезд у суседнюю краіну на Пастаўшчыне запісалася 2487 чалавек, пераважна заможных сялян-аднаасобнікаў, але толькі частка з іх змагла выехаць. Прычына таму – пазіцыя раённых уладаў, якія жорстка адмоўна паставіліся да гэтых жыхароў, лічачы, што яны патрапілі пад уплыў польскай нацыяналістычнай прапаганды.

Пасля II сусветнай вайны нацыянальны склад насельніцтва раёна вызначаецца адноснай стабільнасцю, калі звяртаць увагу на дамінантную долю беларусаў у агульнай колькасці жыхароў, якая складае каля 80 %. Разам з тым, варта заўважыць, што адбылося павелічэнне долі рускіх у нацыянальнай структуры з 1 % ў даваенны час да 13 % у 70-я гады. Гэту з'яву можна звязаць з новай хваляй русіфікацыі края. Адразу пасля вайны для ўсталявання савецкай улады і правядзення калектывізацыі з Расіі была накіравана значная група чыноўнікаў. Навучанне ў Пастаўскім педагагічным вучылішчы, большасці школ, асабліва ў горадзе і пасёлках, пераведзена на рускую мову. На гэтай жа мове пачало весціся справаводства на прадпрыемствах, арганізацыях і ўстановах. Адметнасцю раёна стала і яго мілітарызацыя: з прычыны насычанасці вайсковымі злучэннямі Паставы замелі "славу" самага ваеннага горада Беларусі. На нашай зямлі праходзілі службу прадстаўнікі розных нацыянальнасцей, прычым частка служылых людзей засталася тут на пастаяннае жыхарства. Гэта таксама паўплывала на павелічэнне долі рускіх і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Для вызначэння тэндэнцый у развіцці этнічных працэсаў канца XX стагоддзя разгледзім вынікі апошніх перапісаў насельніцтва (1979, 1989, 1999 г.г.) па асобных нацыянальных групах.

**Беларусы**. Доля прадстаўнікоў тытульнай нацыі Беларусі ў 1979 годзе складала 82, 9 % (47 856 чалавек). За наступнае дзесяцігоддзе іх колькасць зменшылася амаль на 9 тысяч (стала 38 876 чалавек), а доля ў агульнай колькасці насельніцтва панізілася да 77, 9 %. На такую статыстыку паўплывалі тры асноўныя прычыны: адмоўны натуральны прырост, міграцыі і павелічэнне колькасці палякаў (пад час перапісу частка беларусаў-католікаў запісалася палякамі).

У наступнае дзесяцігоддзе пры агульным змяншэнні колькасці насельніцтва ў раёне на 1, 5 тысячы чалавек, беларусаў паболела на 175 чалавек, а іх доля ўзрасла да 80, 8 %. Можна меркаваць, што такая тэндэнцыя звязана з працэсамі беларусізацыі, якія актыўна праводзліся ў пачатку 90-х гадоў, і з міграцыяй: у раён вярнуліся беларусы з іншых рэгіёнаў былога СССР. Павышэнне долі прадстаўнікоў карэннай нацыянальнасці звязана і са змяншэннем колькасці прадстаўнікоў іншых народаў.

Перспектывы развіцця беларусаў як этнасу вельмі складаныя. Жывучы на роднай зямлі, яны аднак знаходзяцца ў чужародным этнакультурным асяроддзі: новая хваля русіфікацыі выштурхоўвае беларускую мову з радыё і тэлебачання, са школ, установ і арганізацый; чыноўнікі розных рангаў выпінаюцца размаўляць выключна па-расійску. Вал маскультуры праз сродкі масавай інфармацыі вымывае асновы традыцыйнага беларускага менталітэту. Беларуская вёска, якая раней заўсёды была калыскай мовы і беларускага светагляду, фактычна разбурана і знаходзіцца ў стадыі агоніі. Духоўая дэградацыя ідзе поруч з фізічнай: смяротнасць пастаянна павялічваецца, нараджальнасць падае... Палітыка разбурэння нацыянальнай самасвядомасці можа прывесці да таго, што пад час наступнага перапісу доля беларусаў зменшыцца да 50 – 60 %...

**Рускія**. Як адзначалася, доля рускіх у насельніцтве раёна да сярэдзіны ХХ стагоддзя была заўсёды нязначнай – не болей 1 – 2 %. У 60-70 гадах іх колькасць і, адпаведна, доля рэзка выраслі. Прычыны гэтай з'явы былі разгледжаны вышэй. На 1979 год у раёне пражывала 7367 рускіх, што складала 12, 8 % усяго жыхарства. За апошнія 20 гадоў назіраецца тэндэнцыя памяншэння колькасці і долі рускіх у насельніцтве Пастаўшчыны. У 1999 годзе на нашай тэрыторыі пражывала 5492 прадстаўнікі рускага народа (11, 4 %). У перспектыве палітыка русіфікацыі можа прывесці да павелічэння долі і колькасці рускіх за кошт дэнацыяналізаванага беларускага насельніцтва.

**Палякі**. Самыя значныя змены ў колькасці жыхароў у канцы ХХ стагоддзя назіраліся ў групе палякаў. З 1979 па 1989 год іх лік вырас з 548 да 3667 чалавек, гэта значыць павялічыўся ў 6, 7 раза (!). Вядома, што ні натуральны прырост, ні міграцыі не маглі даць такіх лічбаў. Адбыцца гэта магло толькі з прычыны "пераходу" часткі беларусаў-католікаў у "палякі". А паспрыяла гэтаму перабудова і дэмакратызацыя грамадскіх працэсаў ў Савецкім Саюзе, асабліва змена падыходаў да рэлігіі ўвогуле і да каталіцызма і касцёла ў прыватнасці. Далучэнне жыхарства да пераважна польскамоўнага касцёла, настальгія пажылых людзей па часах сваёй "крэсавай" маладосці, актыўная пазіцыя вернікаў сталіся тымі прычынамі, што і выклікалі рэцыдыў "польскасці". За наступныя 10 гадоў колькасць людзей, якія запісаліся палякамі, паменшылася амаль на 1300 чалавек – гэта самае вялікае змяншэнне сярод усіх этнічных груп. Беларусізацыя 90-х гадоў дала магчымасць частцы "палякаў"

усвядоміць сябе беларусамі, але найбольшы мінус дала смяротнасць сярод пажылога насельніцтва.

**Украінцы**. Па колькасці пражываючых у раёне украінцы займаюць 4 месца. У 1979 годзе іх налічвалася больш за тысячу (1267 чалавек), аднак, з цягам часу з прычыны адмоўнага натуральнага прыросту, міграцый і асіміляцыі колькасць украінцаў змяншаецца. Большасць прадстаўнікоў гэтай нацыянальнасці патрапіла на Пастаўшчыну ў пасляваенны час у сувязі з мілітарызацыяй края. Разам з рускімі яны складалі асноўны кантынгент служылага люду. Вайскоўцы і іх сем'і ўтварылі ўкраінскую дыяспару на Пастаўшчыне. У 1999 годзе іх пражывала 818 чалавек (1, 7 %). На сённяшні дзень мясцовыя ўкраінцы уяўляюць сабой у значнай ступені здэнацыналізаваную меншасць, якая перайшла на рускую (зрэдку, беларускую) мову і паступова асімілюецца.

**Літоўцы**. Прадстаўнікі гэтага народа займаюць пятае месца па колькасці у насельніцтве раёна. Працяглая мяжа Пастаўшчыны з Летувой і доўгае існаванне ў адной дзяржаве СССР стваралі добрыя ўмовы для інтэграцыі літоўцаў у насельніцтва раёна, аднак мова, менталітэт, традыцыі і іншыя асаблівасці суседняга народа выконвалі ролю этнічнага бар'ера. Варта заўважыць, што да пасляваеннага часу заходняя і паўночна-заходняя мяжа раёна не з'яўлялася этнічнай мяжой паміж беларусамі і літоўцамі: аж да Вільні ішлі землі, на якіх беларусы і палякі складалі большасць насельніцтва. Свянцяны, Пабрадзе, Новая Вялейка, Гадуцішкі – усе гэтыя месты былі заселены пераважна славянамі. Аркадзь Смоліч у сваёй працы “Геаграфія Беларусі” ў 1919 годзе апісваў Віленскі край як беларускую тэрыторыю.

Этнічная сітуацыя пачала мяняцца пасля перадачы Сталіным Віленскага края Летуве. У 60-70-я гады, калі беларускія ўлады вялі свой народ да камунізму (прыгадаем выказванне М. Хрушчова пра тое, што беларусы першымі прыйдуць у светлую будучыню, бо адмаўляюцца ад роднай мовы), літоўцы грунтоўна і мэтанакіравана праводзілі літуанізацыю Вільні і Віленскага края. На сённяшні дзень на захад ад Пастаўскага раёна знаходзяцца тэрыторыі, дзе абсалютна пераважаюць этнічныя літоўцы. На нашай жа тэрыторыі ў 1999 годзе пражывала 132 прадстаўнікі гэтага народа.

**Яўрэі**. У даваенныя часы яўрэі складалі асноўную частку насельніцтва Паставаў і мястэчак, якія былі вызначаны мяжой аселасці. У час другой сусветнай вайны было ўчынена масавае знішчэнне прадстаўнікоў гэтага народа, асабліва ў Паставах і Дунілавічах. У пасляваенны час захоўваецца тэндэнцыя на

змяншэнне колькасці жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Гэты працэс стаў асабліва імклівым у 80-90 гадах, калі з'явілася магчымасць для эміграцыі ў Ізраіль, Еўропу ды ЗША. Калі ў 1979 годзе на нашай тэрыторыі пражывала 73 яўрэі (0, 1 %), то ў 1999 годзе іх засталься толькі 16 (0, 03 %).

**Татары** – карэнныя жыхары Пастаўшчыны. Колькі іх было расселена князем Вітаўтам у часы ВКЛ на нашай зямлі сказаць немагчыма, аднак па перапісу 1999 года іх налічвалася толькі 106 чалавек (0, 2 %) і лік іх скарачаецца ў асноўным натуральным шляхам.

**Цыганы.** Прадстаўнікі гэтага народа з'явіліся на Пастаўшчыне верагодна яшчэ ў часы росквіту ВКЛ у XIV – XV стагоддзях. У інвентары маёнтка Паставы за 1628 год сустракаюцца прозвішчы мяшчан: Андрэй Цыган, Сімон Цыган, Раман Цыган, Сямён Цыган. Колькасць цыганоў была невялікая і хутка мянялася з прычыны качавога ладу жыцця прадстаўнікоў гэтага народа. Як і яўрэі, цыганы моцна пацярпелі пад час другой сусветнай вайны. Зімой 1942 года ў Манькаўскім лесе каля вёскі Кашыцы фашысты расстралялі 60 цыганоў, якіх схапілі на тэрыторыі раёна.

Адзіны народ (акрамя беларусаў), які павялічыў сваю прысутнасць у раёне – гэта цыганы. У абсалютнай колькасці (152 чалавекі) і ў працэнтных адносінах (0, 3 %) іх нямнога, аднак за апошняе дзесяцігоддзе прырост склаў 136, 9 %. Асноўныя прычыны: высокі натуральны прырост і іміграцыя.

Прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей у раёне налічваецца каля 200 чалавек.

Цікавую інфармацыю ў дадатак да разгледжанага этнічнага складу можна атрымаць з аналізу назваў некаторых вёсак. Асобныя прыклады ўжо прыводзіліся ў тэксце (Маскалішкі, Русіны, Русакі). Разгледзім яшчэ колькі тапонімаў.

Так, у раёне знаходзяцца дзве вёскі з падобнымі назвамі: Рамейкі (Камайскі с/с) і Рамелькі (Шыркаўскі с/с), ёсць прозвішчы людзей: Ромель, Рамейка. Вельмі верагодна, што і назвы вёсак, і прозвішчы сягаюць каранямі ў глыбокую даўніну пачатку II тысячагоддзя нашай эры, калі і Полацкае княства, і ВКЛ мелі стасункі (мірныя і ваенныя) з дзяржавамі паўднёвай Еўропы. Рамеі – даволі распаўсюджанае найменне візантыйцаў, і (вельмі можа быць) прадстаўнікі гэтага народа калісці патрапілі ў наш край. Доказам, хоць і не вельмі пераканаўчым, выступае наступны факт: на поўдні Беларусі ў Столінскім раёне ёсць вёска Рамель, каля якой выяўлена старажытнае паселішча. Дык вось, сярод археалагічных знаходак "...

упершыню ў гэтым арэале знойдзены тры фрагменты антычнай сінопскай амфары” [2, с.534]. Рамеі – рамелькі – рамель – амфара… Ці не дужа многа выпадковых супадзенняў?

Этнонімам з’яўляецца і назва вёскі Ліцьвінкі, што знаходзіцца ў пяці кіламетрах на паўднёвы захад ад Паставаў. “Ліцьвіны” – гэта жыхары летапіснай літвы, а пазней і ўсяго ВКЛ. Калі і адкуль з’явіліся “пастаўскія ліцьвіны”? Можна выказаць меркаванне, што у часы, калі наш край уваходзіў у склад ВКЛ, такая назва ўзнікнуць не магла, бо этнічныя асаблівасці ўжо не былі адметнасцю, а вось раней, у часы нальшчан і лотвы выхадцы з Літвы (Наваградчыны) маглі заснаваць тут паселішча. Варта прыгадаць, што тагачасны ўладар Літвы Міндоўг і Нальшчанскі князь Даўмонт былі жанатыя на родных сёстрах, што ўскосна можа сведчыць пра стасункі паміж жыхарамі розных княстваў.

На верагоднасць прысутнасці ў старажытным насельніцтве раёна мазураў – выхадцаў з паўночна-усходняй Польшчы могуць сведчыць назвы Мазурка, Мацуры, прозвішчы Мацур, Мазур, Мазуркевіч.

Выклікае пэўную цікавасць назва вёскі Сакуны. Яшчэ ў XIX стагоддзі даследчыкамі былі апісаны этнічныя асаблівасці палешукоў-сакунаў. Іх маўленне адрозніваецца ад тыповабеларускага тым, што заместа мяккага “-ся” ў канцы слоў яны гаварылі “-са”: “паваліўса”, “пабіўса”, “хрысціўса” і да т. п. Магчыма гэтыя асаблівасці жыхароў і далі назву вёсцы.

З найменнем этнасу звязана і яшчэ адна назва на Пастаўшчыне. Прусы – такое паселішча знаходзцца недалёка ад Казлоўшчыны. Побач з вёскай – возера Грынвальды, што ў перакладзе з нямецкай азначае Зялёны Лес. І. Зямчонак вылучыў версію, што назва з’явілася пасля перамогі аб’яднаных войск ВКЛ і Кароны над крыжакамі ў Грунвальдскай бітве. Аднак можна дапусціць, што невялікая частка балцкага племені прусаў, ратуючыся ад Тэўтонскіх крыжакоў, асела ў ціхім і глухім кутку нашага края.

Разгледжаныя некаторыя тапанімічныя загадкі-адгадкі з’яўляюцца толькі версіямі ў шэрагу магчымых інтэрпрэтацый. Вельмі верагодна, што мы ніколі не даведаемся сапраўднай хады гістарычных падзей і не здолеем расшыфраваць паходжанне ўсіх назваў, бо покрыва гісторыі таўсцее з кожным годам…

## МОВЫ РОДНЫЯ І ЧУЖЫЯ

Моўная сітуацыя на Пастаўшчыне на працягу стагоддзяў вызначалася складанасцю і, можна сказаць, анамальнасцю, бо існавала дыспрапорцыя паміж мовай побытавай і мовай афіцыйнай, мовай карэнных жыхароў края і мовай меншасцей. Неадэкватная моўная сітуацыя захоўваецца і зараз.

Мова карэнных жыхароў раёна – беларусаў – сфармавалася ў часы Вялікага княства Літоўскага. У XIV стагоддзі яна стала дзяржаўнай і літаратурнай. Асновай старабеларускай мовы, як пісаў Я. Станкевіч, "...сталіся гаворкі паўднёва-полацкія", якія былі пашыраны на тэрыторыях Дзісненскага, Браслаўскага, Дрысенскага і іншых суседніх паветаў[18]. Гэта значыць, што гаворкі насельнікаў Пастаўскага края паслужылі адной з крыніц фармавання старабеларускай мовы. У той час гутарковая мова супадала з афіцыйнай дзяржаўнай. Як вядома, старажытнабеларуская мова ўжывалася тады не толькі ў афіцыйных дакументах унутры краіны, але і выконвала функцыю міжнародных зносін. Пераважная большасць дароўных лістоў, прывілеяў, грамат, купчых, абавязацельстваў XVI стагоддзя, якія тычацца Пастаўшчыны, пісалася на старабеларускай мове (гл. дакументы ў кнізе "Памяць. Пастаўскі раён").

Аднак, пачынаючы з другой паловы XVI стагоддзя назіраецца працэс раздзялення народнай побытавай мовы і афіцыйнай дзяржаўнай. Пасля Люблінскай уніі (1569 г.), калі адбылося аб'яднанне Вялікага княства з Каралеўствам Польскім, вышэйшыя саслоўі пачалі паступова пераходзіць на польскую мову, якая стала па-сутнасці дзяржаўнай. У XVII стагоддзі дакументы, якія датычацца гісторыі нашага края, ужо спрэс польскамоўныя: дароўны запіс Юрыя Шорца Пастаўскаму францысканскаму кляштару (1617 г.), фундушавы запіс С. Бяганскага таму ж кляштару (1617 г.), інвентары Паставаў (1628 г.), Дунілавічаў (1640 г.), Задзева (1649 г.). У сферы адукацыі, якая тады толькі пачынала складацца, існавала польскамоўнае навучанне. Так, вядома пра існаванне каталіцкай пачатковай школы ў Дунілавічах, дзейнасць у Паставах калегіума піяраў. У гэты час размежаванне паміж мовай народнай (беларускай) і шляхецкай (польскай) стала найбольш выразным.

Пасля ўключэння Пастаўшчыны ў склад Расійскай імперыі (падзелы Рэчы Паспалітай) моўная сітуацыя змянілася нязначна: паранейшаму ў афіцыйнай сферы і адукацыі дамінавала польская мова, хоць паболела расійскіх чыноўнікаў ды пачалі адчыняцца брацкія

ўніяцкія, а пасλы скасавання вуніі – праваслаўныя школкі. Аднак паўстанні 1830-31 і 1863 гадоў прымусілі царскі ўрад праводзіць больш жорсткую русіфікатарскую палітыку. Афіцыйнай мовай паступова станавілася руская, а беларуская заставалася мовай простага люду. Толькі ў другой палове XIX стагоддзя пачала адраджацца беларуская літаратурная мова. Прычым пэўны ўнёсак у гэты працэс зрабіў амаль што наш зямляк паэт Адам Гурыновіч (ён родам з Мядзельшчыны). У сваіх творах ён шырока выкарыстоўваў словы і выразы, якія ўжываліся ў гаворках тутэйшых жыхароў. У 1905 годзе на Пастаўшчыне з'явіўся вусны літаратурны твор – верш "Кірха", у якім распавядалася пра бунт каля Лучайскага касцёла. Верш складзены на беларускай мове з пастаўскімі дыялектнымі асаблівасцямі. Беларускае адраджэнне пачатку XX стагоддзя сталася з'явай у культурна-гістарычным развіцці, але зноў жа на тле расійскамоўнай палітыкі.

У часе кайзераўскай акупацыі (1915 – 1917 г.г.) на заходняй частцы Пастаўшчыны (Лынтупшчына, Камайшчына) ў якасці афіцыйнай ужываліся нямецкая і польская мовы.

Пасля ўваходжання Пастаўшчыны ў склад другой Рэчы Паспалітай ("панскай Польшчы") на нашых землях праводзілася актыўная палітыка паланізацыі мясцовага насельніцтва. Польская мова стала мовай справаводства, асветы, рэлігіі і, часткова, побыту. Беларускія школы забараняліся, прыём з беларускамоўных школ у вышэйшыя навучальныя установы абмяжоўваўся, не дазвалялася карыстацца роднай мовай у дзяржаўных установах. Паскарэнню паланізацыі садзейнічаў польскі дзяржапарат, шавіністычны друк, польскія школы і каталіцкі касцёл. Асаблівая ўвага надавалася моладзі. У Пастаўскім павеце дзейнічала 168 школ, гімназія ў Паставах і прагімназія ў Лынтупах. Частку вучняў на вакацыях за дзяржаўны кошт вывозілі на экскурсю ў этнічную Польшчу, каб школьнікі напоўніліся польскім духам.

Такая палітыка дала чаканы вынік: да 1939 года на ўсёй Заходняй Беларусі фактычна не засталося беларускіх школ.

Верасень 1939 года рэзка змяніў моўную сітуацыю ў нашым краі. Пасля далучэння раёна да СССР афіцыйнымі мовамі сталі беларуская і руская, бо для ўсталявання савецкай улады ў раён была накіравана група работнікаў з Расіі і Ўсходняй Беларусі, якія ўзначалілі партыйныя, савецкія, праваахоўныя органы; арганізацыі і ўстановы. Толькі з усходніх раёнаў на адказныя пасады на Пастаўшчыну было прыслана 250 чалавек, у школы – 33 чалавекі. Польская мова фактычна была забаронена, адчыняліся пераважна

беларускамоўныя школы. Польскую прагімназію ў Лынтупах ператварылі ў беларускую няпоўную сярэднюю школу, гімназію ў Паставах – у педагагічнае вучылішча з беларускай мовай навучання. Мясцова газета “Новы шлях” выдавалася на беларускай мове.

Напад Германіі на СССР і акупацыя нямецкімі войскамі нашай зямлі прывялі да ўсталявання новай моўнай палітыкі. Дзяржаўнымі мовамі сталі нямецкая і беларуская: афіцыйныя дакументы выдаваліся на дзвюх мовах. Уся сістэма адукацыі стала беларускамоўнай, зразумела, з абавязковым вывучэннем нямецкай. Выкладанне вялося ў духу нацызма; савецкія і польскія падручнікі спальваліся.

Пасля вызвалення Пастаўскага раёна ад нямецкіх захопнікаў сітуацыя з мовамі зноў карэнным чынам змянілася, на жаль, не на карысць беларусаў. Таксама як і ў 1939 годзе, для ўсталявання савецкага ладу і калектывізацыі ў раён прыехала група кіруючых работнікаў пераважна з Расіі, якая не ведала мовы мясцовага жыхарства. З гэтай прычыны (і не толькі) беларуская мова пачала выціскацца са справаводства і з некаторых сфер жыцця, у першую чаргу з адукацыі: пастаўскае педагагічнае вучылішча, гарадскія школы і некаторыя школы сельскія паступова перайшлі на рускую мову навучання. Карэнныя жыхары – беларусы – пачалі вывучаць у школах сваю родную мову як замежную.

Палітыка дэнацыяналізацыі і русіфікацыі прывяла да таго, што ў пачатку 80-х гадоў XX стагоддзя беларуская мова аказалася выцісненай амаль з усіх сфер жыцця, захоўваючыся толькі ў беларускамоўных сродках масавай інфармацыі, асяродку свядомай творчай інтэлігенцыі ды беларускіх школах на вёсцы. У сельскай мясцовасці жыхары ў побыце карысталіся трасянкай – руска-беларускай моўнай памессю з дабаўленнем асобных польскіх слоў.

Палітычная лібералізацыя сістэмы ўлады і наступны распад СССР са стварэннем сапраўды незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь, далі магчымасць беларусам трэці раз за XX стагоддзе рэалізаваць сваё права на дзяржаўнасць роднай мовы. У 90-х гадах працэс беларусізацыі пачаў набіраць імклівую хаду: на мове загаварылі дзяржаўныя чыноўнікі, павялічыліся наклады беларускіх газет і часопісаў, паступова павялічвалася колькасць беларускіх школ і класаў, пачалі пашыраць сваю дзейнасць беларускія арганізацыі і рухі.

Аднак змена палітычнай сітуацыі ў 1994 годзе прывяла да змянення моўнай палітыкі. Русіфікацыя края пачалася з новым імпэтам, хоць і прыкрываецца гэты працэс дзяржаўнай дактрынай аб

роўнасці дзвюх дзяржаўных моў – рускай і беларускай. У сітуацыі, калі абвешчаны дзве дзяржаўныя мовы, відавочна, што адна з іх будзе сапраўды дзяржаўнай, бо гэта будзе мова справаводства, адукацыі, СМІ, а другая стане выконваць дэкаратыўныя функцыі. Такую з'яву мы назіраем па ўсёй краіне і на Пастаўшчыне ў тым ліку. Справаводства вядзецца поўнасцю на рускай мове, у сродках масавай інфармацыі таксама пануе мова нацыянальнай меншасці, у сферы адукацыі няма ні адной беларускамоўнай ВНУ, колькасць беларускіх школ і класаў пастаянна скарачаецца, чыноўнікі стараюцца паўсюдна выступаць выключна па-руску (хоць і з беларускім акцэнтам)...

А паводле дадзеных перапісу 1999 года ў нашым раёне на беларускай мове дома звычайна размаўляюць 81, 9 % жыхароў (76, 2 % беларусаў і 5, 7 % прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей). Зноў мы бачым сітуацыю, калі моўная палітыка ў раёне і ў краіне праводзіцца не ў інтарэсах большасці, не ў інтарэсах карэнных жыхароў – беларусаў, а на карысць нацыянальнай меншасці і суседняй дзяржавы.

Гістарычны агляд моўных працэсаў ў раёне дазваляе зрабіць некалькі высноў: а) на працягу апошняга тысячагоддзя адбылося дзевяць кардынальных змен у моўнай сітуацыі раёна; б) за ўвесь разгледжаны перыяд гісторыі выдзяляюцца толькі тры этапы (прычым 2 апошнія вельмі кароткія), калі моўныя працэсы развіваліся ў інтарэсах карэннага насельніцтва – беларусаў, астатні час дамінавалі мовы нацыянальных меншасцей (руская і польская); в) ад пачатку XVII стагоддзя і да пачатку XXI афіцыйная дзяржаўная мова не супадае з народнай, штодзённай мовай зносін; г) на працягу амальусёй гісторыі ўладныя структуры пагардліва ставіліся да мовы карэннага насельніцтва, падтрымліваючы і пашыраючы мовы суседніх народаў і дзяржаў.

Пры захаванні такой палітыкі , у перпектыве можа адбыцца поўная русіфікацыя края, выцісканне беларускай мовы з ужытку і, як следства, асіміляцыя, растварэнне беларусаў у рускім этнасе.

## ПАСЕЛІШЧЫ

Асноўнае жыхарства Пастаўшчыны пражывае ў населеных пунктах: горадзе Паставы, гарадскіх пасёлках Лынтупы і Варапаева, 516 вёсках (2001 г.), хутарах.

Першыя селішчы і гарадзішчы ўзніклі на нашай зямлі яшчэ ў мезаліце – неаліце. З цягам часу колькасць іх павялічвалася і ў

пачатку II тысячагоддзя нашай эры ўжо існавала даволі густая сетка паселішчаў. Археалагічныя дадзеныя сведчаць пра тое, што ў розныя часы гарадзішчы або селішчы месціліся ў Паставах ( на беразе возера Задзеўскага і каля Мядзелкі на Гарадзішчы, дзе зараз знаходзіцца касцёл), у Задзеўі, каля Данеўцаў, Саранчанаў, Навадруцка, Сіманаў, Яцэвічаў, Асінагарадка, Сарокаў, Палесся, Кураполля, Лапінцаў, Каралінова, Ёдаўцаў і шэрагу іншых сучасных вёсак і пасёлкаў.

Першае летапіснае ўпамінанне аб паселішчы на нашай зямлі можна сустрэць у кнізе гісторыка С. Д. Фёдарава “Поселения Северо-Западного края Великого княжества Литовского”, якая была выдадзена ў пачатку дваццатага стагоддзя ў С.-Пецярбургу. Аўтар піша: “...В 25 верстах от озера Мездолье находится поселение 5 домов наземное, его сельцы занимались рыбой в озере Задревское. Селение возникло в 996 г. Деспот Зенович приезжий магнат облюбовал это место и основался в 1005 году. После его смерти владел им сын Данут Зенович после его племянник С. Зенович. Поселение перво Посадник было 13 домов.”

Калі пададзеныя звесткі С. Д. Фёдарава сапраўдныя, то Паставы становяцца пятым па старажытнасці горадам на Беларусі пасля Полацка (862 г.), Віцебска (944 г.), Турава (980 г.) і Заслаўя (985 г.) [7, с.1].

Да старэйшых паселішчаў Пастаўшчыны належаць Лынтупы (згадваюцца ў крыніцах пад 1385 годам), Дунілавічы (1473 г.), Камаі (1513 г.), Лучай (1542 г.), Асінагарадок (1567 г.), Манькавічы ( XVI ст.). Гарадскі пасёлак Варапаева ўзнік параўнальна нядаўна (1800 г.) і рост яго звязаны з будаўніцтвам чыгункі і чыгуначнага вузла.

Паселішчы ў залежнасці ад сацыяльнага статуса, колькасці жыхароў, функцыянальнага значэння падзяляліся на розныя групы. У часы Расійскай імперыі на Пастаўшчыне існавалі мястэчкі, фальваркі, засценкі, хутары, маёнткі, выселкі. Асваенне новых земляў вяло да заснавання хутароў і вёсак.

Паводле К. І. Казака, у 1925 годзе ў часы “крэсаў усходніх” ў Пастаўскім павеце налічвалася больш за 1,3 тыс населеных пунктаў. У 1939 годзе іх было 387: 3 мястэчкі, 170 вёсак, 14 маёнткаў, 28 фальваркаў, 72 хутары, 100 засценкаў. Гэтыя лічбы прыведзены ў кнізе “Памяць. Пастаўскі раён”, але яны, відавочна, заніжаны, бо ў пашпарце апісання Пастаўскага раёна на 1 студзеня 1941 года, калі плошча раёна была на палову меншая за сучасную, налічвалася 600 населеных пунктаў. З гэтага вынікае, што на Пастаўшчыне перад другой сусветнай вайной было каля 1, 2 – 1, 3 тысячы паселішчаў.

У пасляваенны час колькасць населеных пунктаў пачала змяншацца. Прычыны былі розныя. Некаторыя невялічкія вёсачкі і хутары былі паглынуты большымі паселішчамі як, напрыклад, Бжэстовіца – Паставамі, Гароднікі – Мольдзевічамі, Свішчаполле – Лынтупамі, Дабраволле і Мечыславава – Цешылавым, Парыж – Навадруцкам. Частка вёсак злілася ў буйнейшыя. Асабліва гэта датычыцца выселкаў, якія мелі лічбавыя азначэнні ( Першыя, Другія) або характарыстыкі велічыні (Вялікія, Малыя). Так, з Крывога-1 і Крывога-2 утварылася вёска Крывое. Гэткім жа чынам утварыліся Лапінцы, Васіліны, Пушча, Няверышкі. Шляхам аб'яднання Вялікіх і Малых з'явіліся на картах Паташня, Цырклішкі, Волься. Старое Заўлічча злілося з Новым, а Дзядзенкі Дольныя з Дзядзенкамі Горнымі. Два населеныя пункты зніклі ў выніку пажараў: вёска Скакуны і хутар Новы Дзял. Яшчэ два перасталі існаваць з прычыны пераезду жыхароў у іншыя краіны: Венюкішкі – у Польшчу, Чэпішкі – у Літву. Найбольшая ж колькасць вёсак знікла ў выніку ссялення і перасялення ў больш перспектыўныя. Такіх налічваецца 121. Дзве вёскі на Пастаўшчыне былі перайменаваны ў 1966 годзе: Паздзюткі – у Радугу, Цуцкі – у Васточную.

Усяго ж на нашай зямлі за пасляваенны час знікла 214 населеных пунктаў; частка вёсак і хутароў не аднавілася пасля другой сусветнай вайны. Працэс змяншэння колькасці населеных пунктаў назіраецца і ў апошнія дзесяцігоддзі. Так, у 1970 годзе іх было 665, у 1979 – 591, а ў 1999 – 521. У 2001 годзе на Пастаўшчыне налічвалася 517 населеных пунктаў, сярод якіх у трох пражывала гарадское насельніцтва: горад Паставы, гарадскія пасёлкі Лынтупы і Варапаева.

Доля гараджан у агульнай колькасці насельніцтва пастаянна павышаецца. Калі ў 1970 годзе яна складала толькі 33, 6 % , то ў 1989 ужо амаль палову насельніцтва раёна. Напачатку 2002 года ў нашым краі пражывала 46372 жыхары, з якіх 26110 – гараджане, 20262 – вяскоўцы. Узровень урбанізацыі склаў 56, 3 % .

З гарадскіх населеных пунктаў у апошнія дзесяцігоддзі найбольш хуткімі тэмпамі павялічвалася жыхарства ў Паставах. Калі ў 1939 годзе ў райцэнтры было ўсяго 3400 насельнікаў, у 1970 – 15139, то ў 1999 – ужо 21109 чалавек. Аднак пачатак новага стагоддзя прынёс (упершыню за ўвесь пасляваенны час) змяншэнне колькасці жыхароў. Напачатку 2002 года пастаўчан зарэгістравана 20955 чалавек (9668 мужчын і 11287 жанчын).

У Варапаеве з 1979, а ў Лынтупах з 1970 года назіраецца памяншэнне колькасці жыхароў. Калі ў Варапаеве ў 1979 годзе пражывала амаль 4 тысячы чалавек, то ў 2002 – 3235 (1514 мужчын і

1721 жанчына). У Лынтупах у 1970 годзе жыхароў было 2200, у 2002 – 1920 (867 мужчын і 1053 жанчыны).

Хуткі рост колькасці гарадскога насельніцтва, асабліва ў Паставах, адбываўся ў першую чаргу за кошт міграцыі з вёсак і, нязначна, з прычыны дадатнага натуральнага прыросту: яшчэ ў 1993 годзе каафіцыент натуральнага прыросту па Паставах быў + 1, 3, але ўжо з наступнага пачаў расці мінус ад –1, 2 (1994 г.) да – 2, 7 (1998 г.).

Паводле прагнозу, у бліжэйшыя 10-15 гадоў варта чакаць далейшае паглыбленне працэсаў старэння і знікнення вёсак, павелічэння долі гарадскога насельніцтва пры яго агульнай стабілізацыі ці скарачэнні.

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

## КРЫНІЦЫ


1. Аб выніках усесаюзнага перапісу насельніцтва 1989 года ў Пастаўскім раёне // Звязда. – 1990. – 18 верасня. – С. 3.
2. Археалогія і нумізматыка Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1993. – 702 с.
3. Быхавец І. Лынтупы. Гістарычны нарыс. – Паставы: ТБМ, 1993. – 86 с.
4. Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. – Мінск: БелЭн, 1994. – 510 с.
5. Ермаловіч М. Старажытная Беларусь. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 366 с.
6. Зямчонак І. Ваколіцы Парыжа.Старонкі гісторыі Пастаўскага Паазер'я. – Гродна: Ратуша, 2000. – 104 с.
7. Зямчонак І. Колькі год Паставам? // Сумежжа, - 1998. – чэрвень-ліпень. – С. 1.
8. Зямчонак І. Мястэчка пры гасцінцы. – Мінск: Беларусь-Інфарм-Сэрвіс, 1995. – 132 с.
9. Іваноў М. Да гісторыі сталінізму на Беларусі // Ніва. – 1990. – 25 сакавіка. – С. 3.
10. Итоги переписи населения Поставского района за 1999 год. // Пастаўскі край. – 2000. – 1 сакавіка. – С. 3.
11. Канапацкі І. Беларускія татары. // Культура. – 1993. – 17 мая. – С. 4-5.
12. Матэрыялы раённага аддзела статыстыкі Пастаўскага райвыканкама.
13. Памяць. Пастаўскі раён. – Мінск: БЕЛТА, 2001. – 688 с.
14. Пракаповіч І. Дзе нашыя карані? // Сумежжа. – 1993. – 16-31 жніўня. – С. 3.
15. Пракаповіч І. Забыты шлях. // Падарожнік. – 1996. - № 9-10.
16. Пракаповіч І. За цемраю вякоў мінулых. // Пастаўскі край. – 1992. – 13, 20, 24 сакавіка.
17. Сагановіч Г. Невядомая вайна: 1654-1667. – Мінск: Навука і тэхніка, 1995. – 144 с.
18. Сосіс І. Яўрэі на Беларусі. // Спадчына. – 1992. - № 2 – С. 75-81.
19. Станкевіч Я. Гісторыя беларускага языка. – Вільня, 1939.
20. Хрестоматия по истории южных и западных славян. Т 1. – Минск: Университетское, 1987. – 272 с.

**ЗМЕСТ**

Прадмова
1. Колькасць жыхарства і яе змены ў гістарычным часе
2. Нараджальнасць і смяротнасць. Натуральны прырост
3. Сямейны стан. Шлюбы і разводы
4. Дзеці – дарослыя – старыя…
5. Мужчыны і жанчыны
6. Механічны рух насельніцтва. Міграцыі
7. Шчыльнасць і размяшчэнне насельніцтва
8. Вераванні і рэлігіі
9. Плямёны і народы
10. Мовы родныя і чужыя
11. Паселішчы
12. Крыніцы

© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год